САКРЭТЫ СЯМЕЙНАГА ТЫМБІЛДЫНГУ

Сямейная справа

ЧАЛАВЕКУ ПАТРЭБНЫ ЧАЛАВЕК

Сямейная справа

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

24 ЛІСТАПАДА 2022 г. ЧАЦВЕР № 231 (29853)

КАРАТКА

- Фестываль загартоўвання і зімовага плавання пройдзе ў Гродне 27 лістапада.
- **Арганізацыям па дзяржрэгістрацыі забаранілі даваць персанальныя даныя аб уладальніках аб'ектаў нерухомай маёмасці.**
- Колькасць электрамабіляў у Беларусі з 2020 года вырасла амаль у 40 разоў.
- **Вадзім Скрыпчанка стаў галоўным трэнерам футбалістаў мінскага «Дынама».**
- Прафсаюзныя прававыя прыёмы пройдуць сёння па ўсёй краіне.
- **Увосень у вадаёмы краіны засялілі больш за 29 тон рыбы.**

ЦЫТАТА ДНЯ

Вадзім ШАГОЙКА, намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання:

«Для наступнага года ўжо шмат зроблена. Ёсць нюансы толькі па ўмовах надвор'я. Азімыя збожжавыя культуры даюць больш высокія ўраджаі, таму акцэнт сёлета зроблены на іх. У прыватнасці, асаблівая ўвага нададзена азімаму ячменю. Як адзначыў Прэзідэнт, гэта вельмі добрая культура ў плане кармавой яе аддачы. І важна, каб мы бачылі, у каго атрымліваецца працаваць менавіта з гэтай культурай, на месцах павінен быць прафесійны падыход спецыялістаў. Вучонымі даўно вызначана змяняльнасць культур, каб дабіцца максімальнай аддачы ад зямлі, таму задача перад аграрыямі якасна яе выканаць, каб атрымаць патрэбны вынік».

ISSN 1990 — 763X

9 771990 763008 22231

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«НЕЛЬГА ДАПУСЦІЦЬ, КАБ НАС ПАСВАРЫЛІ»

Аб чым гаварыў Прэзідэнт Беларусі на саміце АДКБ у Ерэване

Фота БелТА.

Учора ў Ерэване прайшла сесія Савета калектыўнай бяспекі АДКБ. Мерапрыемства ладзілася ў вузкім і пашыраным саставах. Лідары краін абмеркавалі актуальныя праблемы міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі, асноўныя вынікі дзейнасці АДКБ у міжсесіённы перыяд. Удзельнікі саміту таксама разгледзелі шырокі пералік пытанняў, якія датычацца розных сфер і напрамкаў узаемадзеяння.

З улікам пераходу старшынства ў АДКБ да Беларусі ў 2022—2023 гадах Аляксандр Лукашэнка агучыў прыярытэтныя напрамкі, на якіх у гэты перыяд трэба сканцэнтраваць сумесныя намаганні. У прыватнасці, кіраўнік дзяржавы запэўніў, што беларускае старшынство прыме ўсе магчымыя дыпламатычныя намаганні, накіраваныя на дээскалацыю напружанасці, змяншэнне канфліктнага патэнцыялу, а таксама на павышэнне ўзроўню ўзаемнага даверу праз сумесныя дзеянні членаў АДКБ. «Праз салідарнасць і супрацоўніцтва — да міру і бяспекі», — агучыў Прэзідэнт дэвіз беларускага старшынства.

Ён нагадаў тэзіс аб тым, што аднапалярная сістэма светаўладкавання беззваротна адыходзіць у мінулае. «Гэты працэс правакуе бязмежны па сваёй глыбіні і маштабе крызіс сістэмы міжнародных адносін з мноствам болевых пунктаў па ўсім зямным шары. Шэраг гэтых пунктаў, на вялікі жаль, знаходзіцца на еўрапейскай і еўразійскай прасторы, у тым ліку ў зоне адказнасці АДКБ», — канстатаваў беларускі лідар.

НАТА СУПРАЦЬ БЕЛАРУСІ І РАСІІ

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што сёння адбываецца ў Еўрапейскім рэгіёне. Паводле яго слоў, Паўночнаатлантычны альянс канчаткова замацаваў антырасійскі і антыбеларускі вектары дзейнасці арганізацыі на аглядную перспектыву і з уласнай ініцыятывы спыніў усе кантакты.

«Пад маркай стрымлівання нібыта агрэсіўных паводзін Расіі і яе саюзніка ў ідзе планамернае нарошчванне ваеннай прысутнасці Штатаў і іншых краін НАТА каля заходніх граніц АДКБ, гэта значыць, каля нашых граніц. Захад працягвае перакідваць на ўсходні фланг НАТА войскі, узбраенні і ваенную тэхніку. Павышаецца інтэнсіўнасць іх мерапрыемстваў аператыўнай і баявой падрыхтоўкі. Што гэта, як не засваенне патэнцыяльнага тэатра баявых дзеянняў?» — лічыць кіраўнік дзяржавы.

У сувязі з гэтым нядаўна прынятае рашэнне аб разгортванні рэгіянальнай групоўкі войскаў Беларусі і Расіі Прэзідэнт назваў натуральнай рэакцыяй на існуючыя выклікі.

«На краіны, якія імкнуцца ісці па сваім шляху развіцця і праводзяць самастойны знешнепалітычны курс, аказваецца вельмі жорсткі прэсінг. Пад свой кантроль спрабуюць паставіць і міжнародныя арганізацыі, уключаючы ААН, — канстатаваў беларускі лідар. — Выдаткі на ўзбраенне растуць нябачанымі тэмпамі і дасягаюць жахлівых велічынь». Уряды краін — членаў НАТА, падбухтораныя Вашынгтонам, ахвотна марнуюць мільярды на ўяўную пагрозу з Усходу, пры гэтым стымулюючы ваенна-прамысловы комплекс ЗША».

СТАР. 2

Эканамікс

СТАНОЎЧЫЯ ВЫНІКІ НАСУПЕРАК ЗНЕШНІМ УМОВАМ

Намеснік прэм'ер-міністра Пётр ПАРХОМЧЫК расказаў, як працуюць прамысловы, нафтахімічны і энергетычны комплексы краіны

З адпаведным дакладам віцэ-прэм'ер выступіў на сумесным пасяджэнні абедзвюх палат Нацыянальнага сходу. Пётр Пархомчык не толькі расказаў аб выніках дзейнасці галіны на бягучы перыяд, але і абазначыў перспектывы развіцця гэтых сегментаў эканомікі з улікам цяперашніх сусветных тэндэнцый.

Фота БелТА.

ПАЗІТЫЎНАЯ ДЫНАМІКА

Сёння прамысловы комплекс фарміруе амаль трэць ВУП краіны і каля 80 % экспарту тавараў. Па выніках 10 месяцаў бягучага года аб'ём прамысловай вытворчасці склаў 94,1 % да адпаведнага перыяду 2021 года. З ростам да мінулага года спрацавалі прадпрыемствы Міністэрства прамысловасці, дрэваапрацоўкі і канцэрна «Белдзяржхарчпрам». У нафтаперапрацоўцы і лёгкай прамысловасці пакуль не дасягнуты мінулагодні ўзровень, аднак дынаміка аднаўлення вытворчасці станоўчая. Канцэрн «Белнафтахім» забяспечыў аб'ём вытворчасці на ўзроўні 87,5 % да мінулага года, канцэрн «Беллегпрам» — на ўзроўні 96,4 %.

СТАР. 3

Нястрачаная спадчына

ПА ЛАБІРЫНТАХ СТАГОДДЗЯЎ

Новыя інтэр'ерныя залы Старога замка ў Гродне будуць даступныя наведвальнікам да канца года

sb.by

Цяпер тут вядуцца завяршальныя работы. Пакуль усё ў будаўнічых лясах. Але контуры ўжо відавочныя. Усе чатыры пакоі інтэр'ерныя. Гэта значыць, будуць ураждаць не экспанатамі, а самім выглядам — формай, ляпнінай, вітражамі, камінамі ды іншымі рэчамі. Усе залы нясуць на сабе гістарычны адбітак і мастацкі густ.

ШТО ЎРАЗІЦЬ?

— Зараз у рабоце чатыры інтэр'ерныя экспазіцыі — гэта замкавая капліца, алебастравая зала, каралеўская лазня і пакой, дзе мог жыць каралеўскі сакратар. Ён увесь час быў пры каралі і напісаў запіскі аб вайне Стэфана Баторыя з Іванам Грозным, — расказаў **дырэктар Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея Юрый КІТУРКА**. — Залы да канца года павінны быць гатовы. Над імі цяпер працуе «Белрэстаўрацыя» разам з субпадрадчыкамі. Там прадугледжаны роспісы на сценах, на столі, каміны, жывапіс... Многа зроблена рэчаў з металу. З лідскага прадпрыемства прывезены вельмі прыгожыя свяцільнікі, якія хутка ўстановяць.

У кожным пакоі работы вядуцца адразу па ўсіх кірунках. Напрыклад, у так званай каралеўскай капліцы ўражвае вялікая печ. Кладку прыгожых кафляў вядуць супрацоўнікі ААТ «Белрэстаўрацыя» Мікалай Ануфрыеў, Яўген Білей і Аляксандр Ярмак. Яны настроены скончыць работу ў тэрмін. Тэматыка вітражоў, а таксама роспіс столі і сцен адпавядае канцэпцыі каралеўскай капліцы. Апошнім штрыхом стане ўстаноўка аналоя.

СТАР. 13

«НЕЛЬГА ДАПУСЦІЦЬ, КАБ НАС ПАСВАРЫЛІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Усё гэта, звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка, адбываецца на фоне заклапочаных выказванняў асобных прадстаўнікоў тых жа краін аб праблемах, якія з'яўляюцца ў галіне глабальнай харчовай, энергетычнай і іншай бяспекі.

ЯДЗЕРНЫ ШАНТАЖ НЕ ДА МЕСЦА

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ўсё часцей гаворка заходзіць аб магчымасці прымянення ядзернай зброі. «Тое, што нельга было ўявіць яшчэ 2-3 гады таму. Ядзерная рыторыка асобных заходніх лідараў зашкальвае. Польскае кіраўніцтва дэкларуе гатоўнасць размясціць у сябе ядзерную зброю. Добра, што ў амерыканцаў, трэба аддаць належнае ім, яшчэ захаваліся разважныя людзі, якія цудоўна разумеюць небяспеку ядзерных гульняў, асабліва з непрадказальнымі партнёрамі», — сказаў Прэзідэнт.

«Наша цвёрдае перакананне — ядзернаму шантажу не павінна быць месца ў міжнароднай палітыцы!» — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён нагадаў вядомую тэзу аб тым, што ў ядзернай вайне не будзе пераможцаў: «Вялікі фізік Альберт Эйнштэйн калісьці сказаў: «Я не ведаю, якой зброяй будзе весціся трэцяя сусветная вайна, але чацвёртая — палкамі і камянямі».

ТРЭБА СПЫНІЦЬ КРОВАПРАЛІЦЦЕ

Аляксандр Лукашэнка ў сваім выступленні выказаўся і пра канфлікт ва Украіне. «Беларусь пастаянна і настойліва папярэджвала аб небяспечнай эскалацыі ваенна-палітычнай сітуацыі ў Еўрапейскім рэгіёне. Мы ўказвалі на дэградацыю сістэмы міжнароднай бяспекі, абясцэненне пагадненняў у галіне раззбраення і кантролю над узбраеннямі. На жаль, тады нас з вамі не слухалі. І трагічны вынік гэтай напышлівай пазіцыі мы бачым сёння ва Украіне», — канстатаваў беларускі лідар.

Прэзідэнт нагадаў, што Беларусь пачынаючы з 2014 года рабіла і прадаўжае рабіць усё магчымае для спынення дадзенага канфлікту.

«Краіны Захаду абвінавацілі і працягваюць абвінавачваць нас ва ўсіх смяротных грахах. Спрабуюць усімі сіламі ўцягнуць Беларусь у гэты канфлікт, хоць самі па вушы ў тое ўцягнутыя. На іх палігонах праходзяць навучанне тысячы ўкраінскіх салдат па натаўскіх праграмах. Кіеў забяспечваецца заходнім узбраеннем і ваеннай тэхнікай», — адзначыў беларускі лідар. — Што гэта, калі не прамая ўцягнутасць у канфлікт? А як разумець заявы генсека НАТА, які кажа, што паражэнне Украіны будзе азначаць паражэнне Паўночнаатлантычнага альянсу?»

Ён параўнаў падзеі ва Украіне з тарнада, які набірае сілу і зацягвае ў сваю варонку ўсё большую колькасць краін, ствараючы ўсё новыя праблемы. «Трэба спыніць гэта кровапраліцце і пачаць перагаворы аб міры. Пытанне ў тым, ці дадуць Украіне сесці за стол перагавораў», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

ІСЦІ МІРНЫМ ШЛЯХАМ

Гаворачы аб існуючых выкліках і пагрозах, Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што няпростая сітуацыя складваецца і ў АДКБ. Надзённая на сёння праблема — канфлікт Арменіі і Азербайджана. «Я паўтару, што сказаў на пасачарговай сесіі СКБ 28 кастрычніка: мы хочам, каб канфлікт паміж дзвюма суседнімі і дружалюбнымі нам дзяржавамі быў урэгуляваны мірным шляхам», — падкрэсліў беларускі лідар.

«Трэба разумець, што канфлікт паміж дзвюма суседнімі і блізкімі, дружалюбнымі нам дзяржавамі. Толькі ў гэтым прычына. Не таму, што мы жадаем дагадзіць аднаму боку ў шкоду іншаму. Армяне нам не чужыя людзі, і мы жадаем іх падтрымаць. Але ў гэтым плане павінен быць рух найперш Арменіі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Але я ў сувязі з гэтым не разумею, можа быць, нехта растлумачыць, навошта тут у тым канфлікце, акрамя Расіі, якая ўцягнута ў пасрэдніцтва, яшчэ Еўрасаюз і АБСЕ? — акрэсліў пытанне кіраўнік дзяржавы. — Каб далей забіваць кол у адносіны паміж намі, паміж саюзнікамі? У гісторыі заўсёды было так. Мы ведаем, да чаго прыводзіць такога роду «пасрэдніцтва». Проста будзе як мінімум замарожаны гэты канфлікт зноў на доўгія гады. Ім не патрэбныя стабільнасць і мір у нашым рэгіёне, а патрэбна разруха, якая кіруецца імі».

Прэзідэнт звярнуў увагу, што канфліктная сітуацыя на граніцы Кыргызстана і Таджыкістана з той жа оперы. «Нас сутыкаюць ілбамі», — падкрэсліў ён.

Прэзідэнт лічыць, што задача саюзнікаў па АДКБ — дапамагчы згаданым краінам прайсці шлях па ўрэгуляванні канфліктнай сітуацыі. «Не трэба гэтых боек. Таму што ў гэтае вогнішча будуць палены ўвесь час і галавешкі падкідваць. Гэта нам не трэба», — сказаў ён.

САЮЗНІЦКІЯ АДНОСІНЫ — ВЕЛІЧЫНЯ НЯЗМЕННАЯ

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў важнасць захавання саюзніцкіх адносін: «У гэтым бурным і імклівым свеце, які змяняецца, нашы саюзніцкія адносіны павінны застацца нязменнай велічынёй. Нельга дапусціць, каб нас пасварылі, пасеялі паміж намі насенне супярэчнасцяў і рознагалоссяў. Ад гэтага будзе залежаць будучыня і нашых краін, і нашай арганізацыі».

Прэзідэнт канстатаваў, што за мінулыя 30 гадоў з моманту падпісання Дагавора аб калектыўнай бяспекі і 20-годдзя стварэння АДКБ пройдзены вельмі няпросты шлях фарміравання ваенна-палітычнага саюза і яго трансфармацыі ў сучасную шматфункцыянальную арганізацыю. «Нам выцыццёва важна ўмацоўваць згуртаванасць і салідарнасць унутры АДКБ, часцей звяртацца па дапамогу адзін да аднаго і не шукаць яе на баку, — падкрэсліў беларускі лідар. — Чым мацней будзе ўнутранае адзінства, тым мацней наша арганізацыя, тым больш будуць яе паважаць іншыя, тым больш эфектыўна яна будзе адпавядаць кантэксту рэгіянальнай і глабальнай бяспекі, які эвалюцыянуе».

Ён заявіў аб неабходнасці адаптаваць АДКБ пад змены выклікаў і пагроз. «Для гэтага ў арганізацыі ёсць магутны калектыўны патэнцыял. Ёсць і канкрэтныя пункты росту», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што эфектыўнасць дзейнасці АДКБ у многім залежыць ад работы сакратарыята і генеральнага сакратара. Карыстаючыся выпадкам, ён падзякаваў Станіславу Засю за работу ў арганізацыі ў няпросты час.

Кіраўнік дзяржавы заявіў і аб падтрымцы кандыдатуры Імангалі Тасмагамбетава, дзяржаўнага і палітычнага дзеяча Казахстана, у якасці новага генеральнага сакратара АДКБ.

Паводле БелТА.

Парламенцкі дзённік

АМНІСТЫЯ, САНАЦЫЯ І ЛІЗІНГ

Сенатары адобрылі шэраг законапраектаў

Падчас дзясятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу сёмага склікання сенатары адобрылі шэраг законапраектаў. Разгледжаныя новаўвядзенні датычыліся амністыі, аховы спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг і змяненняў кодэксаў па пытаннях адміністрацыйнай адказнасці. Больш падрабязна аб некаторых з іх — у матэрыяле «Звязды».

«Аб амністыі ў сувязі з Днём народнага адзінства»

Законапраект сенатарам прадставіў **міністр унутраных спраў Іван КУБРАКОЎ**:

— Праект закона распрацаваны па даручэнні Прэзідэнта. У нашай дзяржаве заўсёды прымяняецца прынцып гуманізму ў адносінах да асоб, якія адбываюць крымінальнае пакаранне. Дзяржава не толькі карае, але і дае магчымасць асуджаным, якія выправіліся, датэрмінова вызваліцца ад адбывання пакарання», — адзначыў міністр.

Сярод новаўвядзенняў: скарачэнне тэрміну пакарання на адзін год за здзяйсненне злачынстваў, звязаных з незаконным абаротам наркатычных сродкаў, толькі асобам да 18 гадоў. Таксама прапануецца скараціць тэрмін пакарання на адзін год асобам, якія ўчынілі карупцыйныя злачынствы.

— Традыцыйна прымяненне закона будзе ахыццяўляцца толькі ў дачыненні да асоб, якія станоўча характарызуюцца ў перыяд адбывання пакарання, а таксама поўнасцю кампенсавалі ўрон, прычынены злачынствам, — падкрэсліў Іван Кубракоў.

Таксама было адзначана, што дзеянне закона аб амністыі прапаноўваецца не распаўсюджваць на асоб, якія ўчынілі злачынствы тэрарыстычнай або экстрэмісцкай накіраванасці.

«Аб урэгуляванні неплацежаздольнасці»

Законапраект, прадстаўлены **міністрам эканомікі Аляксандрам ЧАРВЯКОВЫМ**, прадугледжвае захаванне вытворчых комплексаў і аднаўленне плацежаздольнасці праз стымуляванне своечасовага абвяшчэння прадпрыемствам сваёй неплацежаздольнасці і сыходам пад абарону закона:

— Яго неабходнасць выклікана патрэбамі эканомікі і рэалізацыяй вопыту антыкрызіснага кіравання. Праект закона ўдасканальвае механізм папярэджвання банкруцтва і дасудовага аздараўлення праблемных прадпрыемстваў, — адзначыў міністр.

Як распавяла **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ**, працэдура неплацежаздольнасці — не прысуд, а важны інструмент, які дазваляе ў рэжыме санацыі зрабіць работу над памылкамі, вярнуць устойлівасць прадпрыемству.

«Аб аб'яднаннях наймальнікаў»

Дакументам прадугледжваюцца: парадак стварэння і ліквідацыі аб'яднанняў наймальнікаў, статус, прававое становішча, прынцыпы дзейнасці, асноўныя мэты і задачы, а таксама правы і абавязкі аб'яднанняў наймальнікаў і членаў аб'яднанняў наймальнікаў, патрабаванні да статута аб'яднання наймальнікаў; вызначэнне ўмоў для ўключэння аб'яднання наймальнікаў, створаных у выглядзе асацыяцый (саюзаў), у рэестр аб'яднанняў наймальнікаў; уводзіцца паняцце Канфедэрацыі наймальнікаў Рэспублікі Беларусь.

Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ахове правоў спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг»

Законапраект, прадстаўлены міністрам жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэем Хмелем, прадугледжвае прадстаўленне права мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, а таксама адміністрацыям горада Мінска вызначаць сваімі рашэннямі выканаўцаў для аказання жыллёва-камунальных паслуг і выканання работ па добраўпарадкаванні па-за залежнасцю ад крыніцы фінансавання.

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ адзначыў:

— Жыллёва-камунальная гаспадарка забяспечвае стварэнне неабходных умоў для камфортнага пражывання людзей. Адны з прыярытэтаў — якасць і своечасовае аказанне паслуг. Дадзены законапраект прапаноўвае пашырыць паўнамоцтвы мясцовых органаў улады, што дазволіць многія пытанні вырашаць аператыўна і якасна. Напрыклад, працэдуру закупак.

«Аб змяненні кодэксаў па пытаннях адміністрацыйнай адказнасці»

Законапраект сенатарам прадставіў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Палаты прадстаўнікоў Васіль ПАНАСЮК**:

— Пытанні цэнаўтварэння хвалююць кожнага грамадзяніна нашай дзяржавы. Сёння дзяржаўнае рэгуляванне цэн — той механізм, які накіраваны найперш на забеспячэнне сацыяльных гарантый і эканамічнай стабільнасці ў грамадстве, каб не дапусціць зніжэння ўзроўню дабрабыту нашых грамадзян. Кіраўнік дзяржавы неаднаразова абазначаў сваю пазіцыю аб недапушчальнасці рэзкіх скачкоў цэн у краіне і падкрэсліваў, што ўсе дзяржаўныя органы павінны забяспечыць эфектыўны кантроль цэнаўтварэння. Мы павінны спыніць любыя спробы неабгрунтаванага завышэння цэн, — падкрэсліў Васіль Панасюк.

Арына КАРПОВІЧ.

ДЗЕЛЯ КАМФОРТУ І ПАЛЯПШЭННЯ ДАБРАБЫТУ

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў разгледзелі законапраекты, накіраваныя на абарону правоў спажыўцоў тавараў і жыллёва-камунальных паслуг

З мэтай рэалізацыі аднаго з пунктаў Дырэктывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 10 «Аб недапушчальнасці росту цэн», а таксама з улікам пастановы Савета Міністраў № 713 «Аб сістэме рэгулявання цэн» адразу ў двух чытаннях адобраны праект Закона «Аб змяненні кодэксаў па пытаннях адміністрацыйнай адказнасці».

Як адзначыў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Васіль ПАНАСЮК**, дзяржаўнае рэгуляванне цэн з'яўляецца крыніцай сацыяльных гарантый і эканамічнай стабільнасці, у цэлым недапушчэння зніжэння дабрабыту грамадзян. «Дзякуючы прынятым важным дакументам, праводзячы маніторынг, дэпутаты фіксуюць, што індэкс спажывецкіх цэн падае, але разам з тым актуальнымі застаюцца пытанні павышэння адказнасці суб'ектаў гаспадарання за выкананне правілаў фарміравання цаны, — заўважыў парламентарый. — Мы, дэпутаты, дзяржорганы, не павінны дапусціць любога завышэння цэн, бо парушэнне гэтага парадку падрывае сам алгарытм справядлівага фарміравання цаны, у выніку чаго церпіць просты грамадзянін».

Згодна з законапраектам, Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях дапаўняецца палажэннем, якое ўстанаўлівае адміністрацыйную адказнасць за неўказанне ў таварна-транспартнай або таварнай накладной звестак, звязаных з устанаўленнем цэн на тавары, у адносінах да якіх ажыццяўляецца дзяржаўнае рэгуляванне. Прадугледжваецца адміністрацыйная адказнасць і за ўказанне загадзя несапраўдных звестак, якія выкарыстоўваюцца для ўстанаўлення цаны. Дэпутаты ўпэўненыя, што прыняцце дадзенага закона будзе дадатковай эфектыўнай мерай па выкананні цанавой дысцыпліны суб'ектамі гаспадарання і стабілізацыі далейшай цанавой палітыкі ў краіне.

У другім чытанні разгледжаны законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг». Унесена норма, якая дае права Мінскаму гарадскому выканаўчаму камітэту, раённым выканаўчым камітэтам, а таксама адміністрацыям горада Мінска без правядзення працэдур закупак прызначаць і выбіраць сваімі рашэннямі арганізацыі для выканання работ і паслуг на аб'ектах знешняга добраўпарадкавання, а таксама арганізацыі для аказання жыллёва-камунальных паслуг.

— Улічваючы важнасць згаданага законапраекта на месцах, дэпутаты сумесна з усімі зацікаўленымі службамі і ведамствамі максімальна аператыўна і ў сціслыя тэрміны адпрацавалі яго ў другім чытанні, — звярнула ўвагу **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве Аксана ГАЙДУК**. — Норма часовая, будзе дзейнічаць не больш за два гады. Таму за гэты перыяд мы павінны поўнасцю вызначыцца і па падрадных арганізацыях, і па выканаўцах работ і паслуг, якія найбольш якасна могуць выконваць узятыя на сябе абавязацельствы. Мяркую, што такога часу будзе дастаткова для таго, каб усё адпрацаваць. Патрэбна падыходзіць вельмі адказна да выбару падрадных арганізацый. Гэта нясе за сабой і аператыўнасць рэагавання на заяўкі грамадзян, і якасць выканання жыллёва-камунальных паслуг».

Вераніка КАНЮТА.

СТАНОЎЧЫЯ ВЫНІКІ НАСУПЕРАК ЗНЕШНІМ УМОВАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Калі гаварыць пра прамысловасць у цэлым, то за мінулы перыяд 2022 года паказчыкі яе развіцця маюць пазітыўную дынаміку, — звярнуў увагу Пётр Пархомчык. — Сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі па выніках дзевяці месяцаў склала 4 мільярды долараў, дасягнуты максімальны за апошнія дзесяць гадоў узровень рэнтабельнасці продажаў — 10,9 %. Чысты прыбытак вырас на 14 % і склаў 7,5 мільярда рублёў».

У параўнанні з мінулым годам на 42 адзінкі скараціласа колькасць стратных арганізацый. Выручка на аднаго супрацоўніка склала 175 тысяч рублёў, або 109,8 % да мінулага года. Для параўнання: у цэлым па краіне яна склала 140,8 тысячы рублёў. Што датычыцца сярэднямесячнага заробку ў прамысловасці, то ў верасні ён быў 1804 рублі, што вышэй за рэспубліканскі ўзровень — 1637 рублёў. Па выніках 2022 года аб'ём прамысловай вытворчасці чакаецца на ўзроўні 96 % да 2021 года.

Намеснік прэм'ер-міністра адзначыў, што станоўчыя вынікі работы прамысловасці забяспечаны на фоне значнага пагаршэння знешніх умоў. «Санкцыйныя абмежаванні змяняюць геаграфію нашага экспарту і імпарту, разрываюць знешнеэканамічныя сувязі, якія склаліся, і патрабуюць іх пастаяннай трансфармацыі, — канстатаваў Пётр Пархомчык. — Па выніках дзевяці месяцаў экспарт тавараў склаў 27,3 мільярда долараў, або 96,7 % да ўзроўню мінулага года. Пры гэтым у машынабудаванні, лёгкай прамысловасці забяспечаны рост экспарту тавараў да мінулага года».

Аднак, нягледзячы на станоўчыя моманты ў развіцці прамысловага комплексу краіны, віцэ-прэм'ер перакананы, што прымяняць уплыў санкцый не варта. Ім, па яго словах, трэба актыўна супрацьдзейнічаць. У прыватнасці, для нівеліравання санкцыйнага ціску ўрад аператыўна прыняў пакет контрмер, накіраваных перш за ўсё на падтрымку вытворчасці тавараў, вырашэнне пытанняў лагістыкі і перанакіраванне экспарту з недружалюбных краін. Акрамя таго, праведзена значная работа па стварэнні альтэрнатыўных маршрутаў для паставак беларускай прадукцыі на экспарт.

Прынятыя меры даюць свае вынікі. «За дзевяць месяцаў бягучага года ў межах работы па пераарыентацыі экспартных патокаў з заходняга і ўкраінскага напрамкаў, якая праводзіцца, пры скарачэнні экспарту на гэтыя рынкі на 6,1 мільярда долараў экспарт у дружалюбныя краіны вырас на 5,2 мільярда долараў, — канкрэтызаваў Пётр Пархомчык. — У машынабудаванні ўдалося поўнасцю пераарыентаваць экспарт электратэхнічнага абсталявання, наземнага грузавога і пасажырскага транспарту, па іншых пазіцыях работа працягваецца. Прырост экспарту прадукцыі машынабудавання ў дружалюбныя краіны склаў 1,2 мільярда долараў пры зніжэнні ў недружалюбныя на 325 мільёнаў долараў».

Аб'ём экспарту лёгкай прамысловасці поўнасцю пераарыентаваны за кошт нарошчвання паставак у Расію і краіны Азіі. «Як часта справядліва падкрэслівае кіраўнік дзяржавы, крызіс — гэта цяжка, але гэта шанц, гэта магчымасці, — акцэнтаваў увагу намеснік прэм'ер-міністра. — Сапраўды, сыход і прыпыненне дзейнасці замежных кампаній у Расіі наноў адкрылі расійскі рынак літаральна для ўсіх галін прамысловасці».

Яшчэ адна з мер, якая дазваляе развівацца прамысловаму комплексу ў гэты няпросты перыяд, — вялікая работа па імпартазамяшчэнні. Рашэнне аб паглыбленні ўзаемнай беларуска-расійскай інтэграцыі, перш за ўсё ў мэтах імпартазамяшчэння, было прынята прэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі з улікам знешніх умоў, якія складваюцца.

«Палітыка імпартазамяшчэння рэалізуецца па некалькіх кірунках, — расказаў Пётр Пархомчык. — Па-першае, гэта павелічэнне ўзаемнага тавараабароту за кошт прамысловага патэнцыялу, які існуе. Для гэтага ў прамысловасці створаны сумесныя галіновыя падгрупы, якія прапрацоўваюць пералікі крытычнага экспарту (імпарту) бакоў. Другі кірунак — гэта стварэнне новых імпартазамяшчальных вытворчасцяў у межах інтарэсаў Саюзнай дзяржавы. Заключана міжурадавае пагадненне аб выдзяленні крэдытных рэсурсаў у аб'ёме 105 мільярдаў расійскіх рублёў для фінансавання перспектыўных імпартазамяшчальных праектаў. Трэці кірунак — лакалізацыя вытворчасці. У яго развіццё ў 2022 годзе ў краіне рэалізуюцца 33 інвестыцыйныя праекты агульным коштам каля 850 мільёнаў рублёў, у тым ліку з аб'ёмам інвестыцый у гэтым годзе каля 178 мільёнаў рублёў. Чацвёрты кірунак — вытворчасць айчынных аналагаў. Цяпер у вытворчасці імпартазамяшчальных тавараў удзельнічае звыш 2,5 тысячы арганізацый розных форм уласнасці, у тым ліку больш як 600 суб'ектаў малога і сярэдняга бізнесу. Такім чынам, можна канстатаваць, што падыходы, закладзеныя ў імпартазамяшчэнне, ужо паказваюць сваю эфектыўнасць».

АКЦЭНТ — НА ЭЛЕКТРЫФІКАЦЫЮ

Спыніўся Пётр Пархомчык на асобных галінах прамысловасці і перспектывах іх развіцця. Гаворачы аб нафтаперапрацоўцы і нафтахіміі, ён адзначыў, што ва ўмовах страты ключавых рынкаў арганізацыі галіны сёлета вымушана аптымізавалі загрузку магутнасцяў, збалансаваўшы аб'ёмы вытворчасці і рэалізацыі, каб пазбегнуць затаварвання складоў. Выбудаваны новыя схемы экспарту нафтапрадуктаў, што дазволіла не спыніць іх экспарт.

У энергетыцы працягваецца рэалізацыя праектаў, накіраваных на забеспячэнне і павышэнне якасці, надзейнасці і бяспекі энерга- і газазабеспячэння. Ключавы праект — будаўніцтва Беларускай АЭС. Першым энергаблокам станцыі з моманту яго ўключэння ў лістападзе 2020 года ў аб'яднаную энергасістэму выпрацавана больш за 9,5 мільярда кВт/г электраэнергіі, што дало магчымасць замясціць каля 2,5 мільярда куб. метраў прыроднага газу. Агульная гатоўнасць другога энергаблока — больш як 97 %.

З уводам Беларускай АЭС актуальным застаецца пытанне павелічэння электраспажывання ва ўсіх сферах эканомікі, а таксама насельніцтвам. У дадзеным кантэксце працягваецца будаўніцтва новага электрыфікаванага шматкватэрнага і індывідуальнага жылля, так званых электрадамоў. За мінулы год і 10 месяцаў бягучага года ўведзена 563 тысячы квадратных метраў такога жылля. Усяго за пяцігодку плануецца ўвесці каля двух мільёнаў квадратных метраў.

Дзякуючы прынятым у 2020 годзе мерам стымулявання выкарыстання электрамабіляў іх колькасць у краіне павялічылася ў 39 разоў. «Працягваецца будаўніцтва і рэканструкцыя энергетычнай інфраструктуры, — паведаміў віцэ-прэм'ер. — У гэтым месяцы ўведзены ў эксплуатацыю новыя падстанцыі ў Брэсце, у свабоднай эканамічнай зоне «Гродналіявест», а таксама ў Драгічынскім раёне. Да канца года плануецца ўвесці падстанцыю ў горадзе Бяроза».

Дзякуючы планамернай рабоце па зніжэнні выдаткаў і павышэнні эфектыўнасці выкарыстання матэрыяльных і фінансавых рэсурсаў, за апошнія шэсць гадоў тарыф на электраэнергію для спажыўцоў рэальнага сектара эканомікі зніжаны на 11,5 %, для прамысловых спажыўцоў — на 14,5 %. Цана на прыродны газ зніжана на 8,9 %.

АЛЬТЭРНАТЫВА ЕЎРАПЕЙСКІМ БРЭНДАМ

Пётр Пархомчык нагадаў, што ў мінулым месяцы старшыня канцэрна «Беллегпрам» Таццяна Лугіна прапанавала кіраўніку дзяржавы вынікі дзейнасці галіны за бягучы перыяд і расказала аб перспектывах развіцця лёгкай прамысловасці. Прэзідэнтам адносна лёгкай прамысловасці былі пастаўлены дакладныя і зразумелыя задачы: з улікам сыходу замежных гульцоў і скарачэння імпарту заняць нішу на расійскім рынку, а таксама насыціць унутраны рынак, прапанаваўшы нашым грамадзянам якаснае і па прымальнай цане адзенне, абутак і іншую прадукцыю айчыннай вытворчасці.

«Для вырашэння гэтых задач ёсць усё: спецыялісты, абсталяванне, уласная база ў выглядзе льняной і гарбарнай сыравіны, хімічных валокнаў і ніцяў, вытворчасць тканін, гарбарных тавараў, — падкрэсліў намеснік прэм'ер-міністра. — За дзевяць месяцаў бягучага года экспарт тавараў лёгкай прамысловасці склаў 1,3 мільярда долараў, з іх экспарт у Расійскую Федэрацыю — 1,1 мільярда долараў. Пастаўкі тавараў ажыццяўляюцца ў 71 рэгіён Расійскай Федэрацыі. У такія рэгіёны, як Тува, Калмыкія, Алтай і Бурацыя, пастаўкі арганізаваны ўпершыню».

Шырокі асартымент прадукцыі лёгкай прамысловасці сёння дэманструе абноўлены гандлёвы цэнтр «Сталіца». Там жа ёсць крама, у якой можна набыць усім вядомую прадукцыю рэалізаванага праекта «Мерч Першага». Пётр Пархомчык расказаў, што ідзе работа над новым праектам «Да дому», які стане альтэрнатывай такім вядомым еўрапейскім брэндам, як IKEA і Zara Home. Канцэпцыя праекта заключаецца ў размяшчэнні на адной гандлёвай пляцоўцы максімальна шырокага асартыменту беларускай прадукцыі для дому: тэкстылю, посуду, адзення. Такія мультыбрэндавыя крамы з'явяцца як на ўнутраным рынку, так і па-за межамі краіны.

Вераніка КАНЮТА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Foreign Affairs: імкненне канкурыраваць з Расіяй і КНР прывядзе Амерыку да правалу

Імкненне канкурыраваць адначасова з Расіяй і Кітаем прывядзе Амерыку да правалу. Такое меркаванне ў артыкуле для амерыканскага выдання Foreign Affairs выказаў аналітык Рычард Фантэйн, паведамляе РІА «Навіны».

Паводле яго слоў, спроба процістаяць уплыву Расіі і Кітая, нават з дапамогай саюзнікаў, асуджана на правал. Такія імкненні прывядуць да аслаблення, а таксама падарвуць здольнасць Вашынгтона вырашаць найбольш важныя задачы.

Амерыканскі аналітык упэўнены, што менавіта ў гэтым і заключаецца «стратэгічная галаваломка», якую неабходна будзе вырашыць ЗША. Для гэтага Вашынгтону трэба больш тонка расстаўляць прыярытэты ў пытаннях знешняй палітыкі, адзначае аўтар, маючы на ўвазе, што Амерыка не можа процістаяць РФ і Кітаю «ў кожным рэгіёне свету і па шырокім спектры пытанняў».

Еўропа можа пазбегнуць газавага крызісу гэтай і наступнай зімой з-за цёплага надвор'я

Дзякуючы цёпламу надвор'ю, якое трымаецца на тэрыторыі Еўропы ў апошнія тыдні, рэгіёну ўдасца пазбегнуць дэфіцыту прыроднага газу сёлетняй і наступнай зімой. Пра гэта напісала агенцтва Bloomberg.

Як лічаць аналітыкі выдання, бліжэйшай зімой запасы газу ў Еўропе, верагодна, скароцяцца прыкладна на дзве трэці пры ўмове, што надвор'е будзе стабільным, а Расія працягне пастаўкі паліва праз Украіну. У такім выпадку рэгіён зможа перажыць будучы ацяпляльны сезон і атрымаць дастатковы запас паліва для прадухілення крызісу ў зімовы перыяд 2023–2024 гадоў.

Спецыялісты таксама называюць еўрапейскія газасховішчы надзейнымі. «Мы вельмі непакоіліся аб цэнах на энерганосьбіты, і сёння гэтая заклапочанасць зменшылася», — адзначае агенцтва Bloomberg.

Па сутнасці

МОМАНТ ІСЦІНЫ

Кажуць, снарад у адну варонку двойчы не падае. Аднак у сучаснай геапалітыцы заўжды трапляе ў адну і тую ж. У глыбокую прорву англасаксонскай пыхі, у бяздоннае падхалімства каршэрынгавых суверэнітэтаў, у паказальную адсутнасць сумлення.

Можна шмат разважаць, яшчэ больш «глытаць» якаснай паліттэхналагічнай маны і думаць, што валодаеш абсалютнай ісцінай. Нават навукоўцы даказалі: чым больш завышаныя ў чалавека меркаванні пра сябе, тым больш яго «праглынаюць» віртуальная рэчаіснасць наўмысна створаных фэйкаў і канспіралагічныя тэорыі. Мы ўжо на такія граблі наступілі падчас «мяцежнай сенажаці».

Але колькі б тых інфабуч ні было, адзін стрэл — і ўсё зразумела. Украінская ракета СПА трапіла ў польскіх фермераў. Гэта факт. А далей кожны паказаў свой твар. Цэрберы англасаксонскага свету адразу пачалі крычаць: расійская. Нават метадычкі з Вашынгтона яшчэ не прыйшлі, а яны паспяшаліся абвінаваціць Расію. Украіна — зразумела. А прыбалтыйскія лакеі куды ўцягваюцца? Памыліліся. Звычайна палітычна непрадказальны Байдэн «нарадзіў» разумную заўвагу, што гэта не расійская ракета. Няўжо сумленне прачнулася ў палітыка з перыядычна заплюшчанымі вачыма? Глыбей трэба капаць. Глыбейшыя варонкі ў Польшчы ад украінскай ракеты.

Амерыканцы добра разумеюць, што ядзерныя магчымасці Расіі значна мацнейшыя за НАТА. Мацнейшыя і за іх узбраенне, і за іх ідэалагічную зброю. Моцны заўжды спакойны. А вось тыя, хто намагаецца быць такім, заўжды нахабныя ў сваіх паводзінах. Бо прыкласці дамінаваць ва ўсім, імкнуцца, каб 4 ліпеня стала святам для ўсяго свету. Хіба — днём незалежнасці ад амерыканскай экспансіі.

У чалавечых зносінах больш слабы пачынае шукаць апраўданні, сеяць падман, нават істэрыку можа закаціць. Так і ў геапалітыцы. І вось гэтае прызнанне Байдэна — яшчэ і прызнанне палітычных эліт Вашынгтона перад усім светам. Да ядзернага супрацьборства ў Белым доме не гатовыя. Або ўсведамляюць, што няздольныя перамагчы. Гэта не проста эмоцыі, гэта старанна пралічаныя вынікі. Альбо сквапная прага да ўлады. Да палацаў, да ўсмешак усяму свету на адкрытых самітах, да закрытых вечарын на Багамах. Вось таму і заявілі адразу: Расія ні пры чым. Вы скажаце — дэмакратыя і логіка. Не, звычайныя інтарэсы. Мэты, якія апраўдваюць сродкі.

А цяпер да нашых... суседзяў. Да іх рэакцыі. Яны ж на заакіянскіх данатах. З васальскім запалам пачалі брахаць. Нават без каманды «фас». А ці ўсведамлялі яны, што іх інфармацыйная істэрыка магла стаць трыгерам апошняй сусветай вайны? А цяпер яшчэ пра каштоўнасць іх фактаў. Іх праўды. Калі на паверхні звычайная мана становіцца дяржаўнай палітыкай у суседніх з намі краінах. Асабліва сябе праявілі збеглыя беларусы.

На чалавечым горы, на магчымай катастрофе пачалі танцаваць, нібы на касцях загінулых. Калі вы ўжо вылечыцеся ад таго курапацкага сіндрому? Ці ўяўляеце, што яшчэ трошкі — і стрэлкі на гадзінніку суднага дня дасягнулі бы поўначы? Рэакцыя паказала ўзровень палітычнага разумення. І гэтыя людзі ведалі, як кіраваць краінай? А мо гэта звычайны падхалімаж. Шчанячае заляцанне перад тым, як рука ўладара кіне костку. Але ж міма. І ракета, і рэакцыя падначаленых Вашынгтона. Тая рука нават цяпер не здымае трубку, калі звоніць з Кіева. Маўчаць. Мабыць, разважаюць. Правучыць палітычнага клоўна альбо адмовіцца ад яго паслуг?

Там старонку перагарнулі. 5-ы артыкул не дзейнічае. Калі б дзейнічаў, то войскі НАТА павінны былі б заняць Украіну. Навошта, яны і так там. Там і інструктары з Пентагона. Ды і ўвогуле, ці будзе сусветны істэблішмент пэцкацца за летуценнікаў, што мараць аб членстве ў НАТА? Колькі б разоў яны свае петыцыі ні здымалі для «Тэлеграма», усё марна.

Але як такое здарылася, няўжо недаглядзелі амерыканскія назіральнікі за УСУ, ці яны таксама не кантралююць сітуацыю? Або прафесійнасці не хапіла ўкраінскім ваенным. І дарэчы, па чым яны стралялі? Усё ж па расійскіх ракетах, якіх у той час там не было, ці наўмысна па польскім трактары? А чаму не адрэагавала супрацьпаветраная абарона? Ці ўсё сцягнулі пад Херсон і Данецк? І тэхніку, і вайсковцаў. Значыць, размовы пра СПА — з арсенала інфабучы? А можа, гэта Варашава і Кіеў дамовіліся аб правакацыі. Тады як гэта — за спінай Пентагона і рызыкуючы сваім насельніцтвам? І ці можна давяраць такім ваякам сур'ёзную зброю? Адказ на любое з тых пытанняў — фіяска. На любое. Адно зразумела. Якая ў іх праўда, хто ёсць хто... Ды з такімі саюзнікамі Вашынгтону і ворагаў не трэба.

Яўген ПУСТАВОЙ.

РЫЖСКІ СІНДРОМ

Чаму Латвія губляе прывабнасць?

Латвія можа пазбавіцца амаль чвэрці (23,5 працэнта) карэннага насельніцтва ўжо да 2050 года, разам з тым пасля распаду СССР з краіны ўжо выехала амаль 30 працэнтаў латышоў. Аб гэтым піша The Guardian, спасылаючыся на меркаванні экспертаў. Няцяжка падлічыць агульныя страты латышоў. «Для нас гэта экзістэнцыяльная праблема. Кожная нацыя павінна абнаўляцца. Мы не павінны застацца Латвіяй без дастатковай колькасці латышоў», — растлумачыў саветнік латвійскага ўрада па дэмаграфіі Імантс Парадніекс. Паводле звестак Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення Латвіі, летась смяротнасць сярод насельніцтва ўдвая перавысіла нараджальнасць. Каэфіцыент апошняй склаў 1,57, дадзены стратэгічны паказчык вельмі саступае падобнай статыстыцы ў савецкі перыяд. Больш за тое, пачынаючы з лютага 2022-га, штомесяц рэгіструецца найменшая нараджальнасць за апошнюю стогаддзе, з жахам згадаў навінавы партал bb.lv. Чаму ж Латвія губляе прывабнасць?

ЖАХЛІВЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

Паводле даных дэмаграфічнага даследавання еўрапейскага Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення (ЦСУ), у пачатку года сярод 27 дзяржаў — членаў Еўрапейскага саюза самае хуткае змяншэнне жыхароў назіралася менавіта ў Латвіі. Пры гэтым у перыяд з 2001-га да пачатку 2022-га колькасць насельніцтва 27 дзяржаў — членаў ЕС павялічылася на чатыры працэнты — з 429 млн да 447 млн чалавек. А самае хуткае скарачэнне колькасці на працягу апошніх двух дзесяцігоддзяў назіралася зноў-такі ў Латвіі. За гэты час колькасць насельніцтва прыбалтыйскай краіны скарацілася на 20,5 працэнта. Да таго ж, як сведчаць даныя дэмаграфічнага даследавання, і сем'і тут не моцныя. У Латвіі найвышэйшая колькасць разводаў у Еўропе: паводле статыстыкі за 2020 год, 2,7 на тысячу жыхароў.

«Сказаць, што дэмаграфічная сітуацыя ў нашай краіне дрэнная, — нічога не сказаць. Мы, вобразна кажучы, не нараджаемся, але актыўна паміраем», — заўважыў bb.lv. Толькі за дзевяць месяцаў бягучага года нараджальнасць у параўнанні з тым жа перыядам мінулага знізілася яшчэ на 8,2 працэнта — на свет з'явілася 12 221 немаўля. Смяротнасць амаль удвая перавышае нараджальнасць — 22 498 памерлых.

У 1935 годзе насельніцтва Латвіі, паводле перапісу, складала каля 1,9 мільёна чалавек. У 1959-м, праз 14 гадоў пасля кровапралітнай вайны, у рэспубліцы налічвалася ўжо больш чым два мільёны жыхароў. У 1980-м колькасць насельніцтва перавышала 2,5 мільёна чалавек, а ў пачатку 1990-х — 2,65 млн. Насамрэч у Латвіі сёння дэ-факта пражывае менш, чым пазначаныя афіцыйна 1 млн 876 тысяч жыхароў, адзначыў bb.lv. Але нават калі абапірацца на тыя звесткі, то колькасць насельніцтва скарацілася амаль на 800 тысяч чалавек.

Самае ж сумнае — няма ніякіх перадумоў для паляпшэння сітуацыі, заўважыў bb.lv. Пачынаючы з 2016 года, колькасць нованароджаных толькі скарачаецца, пры гэтым не расце і «каэфіцыент узнаўлення» — ён вагаецца ў сярэднім на ўзроўні 1,55-1,57 дзіцяці на адну жанчыну. Латвійскія дэмографы падлічылі, што для ўзнаўлення насельніцтва неабходна, каб на адну жанчыну прыпадала мінімум 2,2-2,4 дзіцяці.

ГРАШОВАЯ ДЗІРКА

Усё гэта — вынік сістэмных праблем, якія ўтварыліся, у тым ліку, у выніку неэфектыўнага кіравання. «Гандлёвы баланс — грашовая дзірка ў эканоміцы», — піша Dienas Bizness. Газета звяртае ўвагу на тую акалічнасць, што «з 1995 года да сёння латвійскі экспартна-імпартны баланс нязменна быў негатыўным і сумарна ўтвараў 64,2 мільярда еўра». Дзелавы штотыднёвік папярэджвае: «Хутчэй за ўсё, прыйшоў бы крытычны момант, калі трэба было б казаць аб неплацежаздольнасці дзяржавы. Фактычна, такая сітуацыя ў Латвіі ўзнікае кожны раз, калі трэба перакрэдытаваць нейкую з вялікіх пазык, бо грошай, каб аддаць, няма. У кастрычніку гэтага года дзяржаўная каса была вымушана перакрэдытаваць 850 мільёнаў еўра. Хутчэй за ўсё, што ў канцы года будуць неабходныя дадатковыя пазыкі, бо, нягледзячы на прагнозы Банка Латвіі, рэцэсія пачалася хутчэй».

Вельмі яскрава праблемы латвійскай эканомікі выяўляюцца ў вытворчасці прадуктаў харчавання. Паводле даных Dienas Bizness, да пандэміі краіна вывозіла штодня 891 тону свежага малака. Аднак цяпер «у імпарту малочных прадуктаў ёсць тэндэнцыя росту, і ў выніку цяпер большую частку нават свежага малака, якое прадаецца ў Латвіі, купляем з літоўскімі або эстонскімі брэндамі».

Ва ўмовах інфляцыі і спажыўцы, і вытворцы прадуктаў харчавання шукаюць спосабы сэканоміць. Пакупнікі шукаюць тавары недарагія, а вытворцы тым часам усімі сіламі зніжаюць сабекошт прадукцыі — шукаюць больш танныя віды энергіі, выпускаюць менш найменняў прадукцыі, змяняюць рэцэпты і ўпакоўку, распавяла Службе навін Латвійскага радыё — 4 кіраўнік Федэрацыі прадпрыемстваў харчовай прамысловасці Латвіі Інара Шурэ. Латвійскія спажыўцы ўсё часцей сутыкаюцца з «інавацыйнымі прадуктамі» на паліцах гастраномаў — напрыклад, вэнджанай каўбасой з выкарыстаннем крухмалу і харчовых дабавак, паведаміў bb.lv.

Па ацэнцы Інары Шурэ, прадпрымальнікі імкнуцца па магчымасці скараціць выдаткі, а таксама адкладваюць інвестыцыйныя праекты, каб перажыць неспрыяльны час. Але ў выніку скарачаецца выбар на паліцах крамаў. Вытворцы, «як той казаў, бы яшчаркі, скідваюць хвост. Калі, напрыклад, фірма вырабляе 100 розных тавараў, то яна ацэньвае, якія тавары больш патрэбныя, і застаецца, напрыклад, 80 тавараў. Апошняе аптымізуе вытворчыя выдаткі, паколькі пераход на іншы прадукт на лініі па-ранейшаму патрабуе часу, што неэфектыўна. Рытэйлеры таксама скарачаюць асартымент тавараў, і робяць тое разам з вытворцамі, у выніку чаго выбар прадуктаў становіцца больш аднастайным», — адзначыла Інара Шурэ.

УРАД НЕ ДЛЯ НАРОДА

Паводле ацэнкі эканамістаў, ва ўмовах крызісу Латвія па ўзроўні пакупніцкай здольнасці адкацілася на дзесяцігоддзе назад, паведамляў lsm.lv. Спажывецкія цэны працягваюць паскораны рост. У кастрычніку гэтага года ў параўнанні з вераснем яны ўзраслі на 0,8 працэнта. Найбольшы ўплыў на змяненне сярэдняга ўзроўню інфляцыі аказаў рост цэн на тавары і паслугі, звязаныя з жыллём, прадукты харчавання і безалкагольныя напоі, а таксама транспартныя тавары і паслугі. У групе прадуктаў харчавання і безалкагольных напіткаў цэны ўзраслі на 29,5 працэнта. Найбольш істотны ўплыў на рост сярэдняга ўзроўню цэн у групе аказала падараванне хлеба (на 36,6 працэнта), кандытарскіх вырабаў (на 27,2 працэнта), мукі і іншых збожжавых прадуктаў (на 63,9 працэнта), макаронных вырабаў (на 35,4 працэнта), рысу (на 41,7 працэнта). «На жаль, сітуацыя ў бліжэйшы час захаваецца нявызначанай, — адзначыў bb.lv эканаміст Дайніс Гашпуйціс. — Найбольшы ціск жыхары адчуюць з-за росту цэн на прадукты харчавання». Як заўважыў эканаміст Петэрыс Страўтыньш, «узровень цэн больш чым утрая перавышае гістарычны сярэдні паказчык у гэтым сезоне, энергія па-ранейшаму вельмі дарагая».

Паводле дадзеных Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення, падзенне ўзроўню жыцця латвійцаў, якія атрымліваюць мінімальную зарплату, гэтай восенню склала каля 22 працэнтаў. Мінімалка не павышалася са студзеня мінулага года, а паказчык інфляцыі апошнія месяцы перавышае 20 працэнтаў. Людзям, якія атрымліваюць мінімальныя і нізкія заробкі, гэтай зімой давядзецца рэзка скараціць усе выдаткі, не звязаныя з выжываннем, і адмовіцца ад ранейшай структуры харчавання. Улічваючы дынаміку цэн на прадукты харчавання, давядзецца скараціць ужыванне мяса, павялічыць спажыванне гародніны і зрабіць бульбу асноўнай крыніцай калорый. Гэта азначае зніжэнне і ўзроўню, і якасці жыцця. Фундаментальныя змены ў структуры пакупак і спажывання закрануць большасць насельніцтва.

Усе гэтыя негатыўныя тэндэнцыі «вельмі шкодныя для ментальнага здароўя», адзначыў Latvijas Avīze псіхатэрапеўт Ніл Канстанцінаў. Эксперт канстатуе нарастанне напружанасці ў грамадстве: «Мяркую, што цяга да гэтай канфрантацыі расла ўжо доўгія гады, зараз толькі яна стала праяўляцца больш ярка». На яго думку, утвараюцца два вельмі расслоеныя бакі, якія не выслухоўваюць меркаванне іншага, але спрабуюць яго толькі перамагчы, выкрасліць».

«Мяне палохае, як хутка пашыраецца раскол паміж рознымі часткамі латвійскага грамадства, і падзел праходзіць не толькі па нацыянальнай прыкмеце», — з горыччу заўважыў мэр горада Рэзекне (дзе нядаўна знеслі манумент савецкаму салдату, які неафіцыйна насіў назву «Алёша») Аляксандр Барташэвіч.

Імкліва зніжаецца ўзровень даверу латвійскага грамадства органам дзяржаўнай улады. «Насамрэч давер — гэта і пытанне бяспекі. Сацыяльнай, эканамічнай, палітычнай, — адзначыў Латвійскаму радыё 4 старшыня праўлення Латвійскага саюза бізнесу Эдуард Філіпаў. — Грамадства паведамляе палітыкам: мы не верым, што нашы сігналы, нават нашу нязгоду ўвогуле чуюць! Гэта вельмі важна, і я думаю, гэта сігнал палітыкам». Член савета Дзяржканторлю Латвіі Мая Абаліня лічыць, што ключ да разумення гэтай тэндэнцыі — у прырытэтах, паведаміў lsm.lv. Яны ва ўрада і грамадства адрозніваюцца.

ЗАПАВЕТНАЯ МАРА

Нядзіўна, што ў латвійскім грамадстве, па прызнанні экспертаў, актыўна пашыраюцца міграцыйныя настроі — людзі імкнуцца збегчы ад рыжскага сіндрому. Многія імкнуцца трапіць у суседнюю Беларусь. Як паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце, па бязвізе нашу краіну наведалі ўжо каля 95 тысяч жыхароў Латвіі. Асобныя атрымалі грамадзянства Беларусі.

Адметная гісторыя Ілы Карозы — латвійскага школьніка, які ў час «Славянскага базару ў Віцебску» ўзяў інтэрв'ю ў Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і з-за ганенняў на радзіме пераехаў у нашу краіну. Разам з сям'ёй яны атрымалі пашпарты грамадзян Беларусі. Мама Ільі, Наталля, падзякавала ўсім беларусам, якія так моцна за іх перажывалі, Прэзідэнту — за яго вялікае бацькоўскае сэрца і ўсім, хто прыняў удзел у лёсе гнанай на радзіме сям'і. Яна падкрэсліла, што зробіць усё магчымае, каб яе дзеці сталі дастойнымі грамадзянамі Беларусі. Ілья Кароза таксама выказаў словы ўдзячнасці ўсім, хто мае дачыненне да яго лёсу. Галоўнае, сказаў новы грамадзянін Беларусі, гэта аказацца ў патрэбным месцы і ў патрэбны час. «Я ўдзячны Богу за тое, што сустрэўся з сапраўдным чалавекам — Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам. У Беларусі кожны чалавек зноў-дзе дапамогу і не будзе кінуты», — падкрэсліў малады чалавек.

Нядаўна Ілья прынёс клятву кадэта ў ліку навабранцаў Віцебскага кадэцкага вучылішча. Паступіць у кадэцкае вучылішча было запаветнай марай маладога чалавека. Ён дадаў, што калектыў яго прыняў як роднага. Настаўнікі заўсёды тлумачаць, калі нечага не зразумеў. З мясцовымі хлопцамі мае зносіны па-сяброўску, ды і сяброў з Латвіі не забывае, стэлефаноўваецца з імі па відэачаце, распавядае, як яму ў кадэцкім вучылішчы. Рыжскія прыяцелі за яго вельмі рады, бо ён здзейсніў сваю мару і ўліўся ў шэрагі навучэнцаў кадэцкага вучылішча. «Гэта пераходны, стартавы момант у ваеннай кар'еры. Пасля заканчэння вучылішча буду паступаць у Ваенную акадэмію на факультэт разведкі, каб абараняць сваю новую радзіму», — падкрэсліў Ілья.

Пётр ДУНЬКО.

❍ Даслоўна

«НАС НЕ ПАДЗЕЛЯЦЬ НІ ШТУЧНАЯ АГАРОДЖА З КАЛЮЧЫМ ДРОТАМ, НІ ВАШЫ ЧАСОВЫЯ ПАЛІТЫКІ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка звярнуўся да народа Латвіі, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. «Спрадвеку народы абедзвюх краін жылі ў сэрцы Еўропы, захоўваючы свае непаўторнасць і самабытнасць, — адзначыў Прэзідэнт Беларусі ў віншаванні з нагоды Дня абвяшчэння Латвійскай Рэспублікі. — Сёння Беларусь таксама застаецца міралюбівай дзяржавай, прыхільніцай дыялогу і агульнай бяспекі ў рэгіёне. Мы ніколі не выступалі ініцыятарам ваеннага канфлікту і заўсёды з прыязнасцю і павагай ставіліся да суседзяў. Многія з вас змаглі пераканацца ў гэтым, наведваючы нашу краіну ва ўмовах бязвізавага рэжыму», — гаворыцца ў віншаванні.

Аляксандр Лукашэнка са шкадаваннем адзначыў: усё больш жыхароў Латвіі адчувае, што іх палітыкі працуюць не на карысць людзей і пазіраюць на замежных дарадцаў. «Абвастраючы абстаноўку, яны сцягнулі ў Прыбалтыку сілы і ўзбраенне, пабудавалі сцены, падштурхнулі вашу краіну да эканамічнай катастрофы. Упэўнены, што нашы шматвяковыя сувязі з'яўляюцца той надзейнай асновай, на якой, нягледзячы на ўсе цяжкасці, будуць адноўлены ўзаемавыгадныя прыязныя адносіны паміж Рэспублікай Беларусь і Латвійскай Рэспублікай. Нас не падзеляць ні штучная агароджа з калючым дротам, ні злачынная барацьба часовых латвійскіх кіраўнікоў з дзяржаўнымі сімваламі, гісторыяй і помнікамі продкаў!» — падкрэсліў Прэзідэнт.

Сямейная газета

Выпуск № 19 (201)

ПАЛІВАЙЦЕ КВЕТАЧКІ, А НЕ ПУСТАЗЕЛЛЕ

Майму сыну пашанцавала. У яго, акрамя бабуль ды дзядуль, ёсць яшчэ і цудоўная прабабуля. Калі Таццяна Віктараўна гасціла ў нас у вёсцы, яны вельмі шмат гулялі з Сымонам: будавалі замкі і дарогі з «Лега» ды кубікаў, збівалі шчаўчкамі з дошкі шашкі, раскладвалі даміно... Вядома, малы не мог доўга ўседзець за адной справай, стаміўшыся, праз хвілін 10—15 пачынаў раскідваць фігуркі ці карткі з малюнкамі па падлозе.

Прабабуля ж, якая прызвычаілася даводзіць кожную справу да канца, штораз уздыхала і паўтарала адну і тую ж фразу: «Сымонка, у цябе зусім няма цярпення». І вось калі Таццяна Віктараўна з'ехала і я, як звычайна, папрасіла сына прыбраць за сабой цацкі, ён адмахнуўся і як пад капірку паўтарыў прабабулін вердыкт: «У мяне няма цярпення». Давялося тлумачыць малому, што калі я была ў яго ўзросце, у мяне таксама яго не хапала. І гэта нармальна. Але такую якасць можна і трэба развіваць, бо яна вельмі спатрэбіцца ў жыцці. З прабабуляй я таксама паразмаўляла: далікатна папрасіла пастарацца не казаць тую фразу непаседліваму праўнуку.

Цалкам згодная з педагогамі, якія практыкуюць мяккую школу выхавання. Апошнія раяць: «Калі нейкае дзіця паводзіць сябе нясціпла, адштурхоўвае іншых — ігнаруй у гэты момант яго паводзіны і як быццам выпадкова скажы яму, што ўсе будуць вадзіць у гульні, але спакойныя і вытрыманыя — часцей. Калі праявіцца агрэсія — строга спыні. Калі дзіця ў нейкі момант паводзіць сябе адэкватна сітуацыі — заўваж тое і пахвалі, абазначыўшы яго добрую якасць, якая праявілася ў дадзены момант. Палівай кветачкі, а не пустазелле». Гэта значыць, жаданыя якасці ці навыкі мы заўважаем, накіроўваем на іх увагу. А тое, што нам не падабаецца, проста ігнаруем (калі гэта не небяспечна для жыцця, вядома). Мне здаецца, такое правіла можна прымяняць не толькі ў дачыненні да дзяцей, але і да ўсіх без выключэння.

Калі я была на рабоце, муж даслаў мне відэа. На ім Сымон еў боршч, прычым кавалачкі моркву з супу былі ў яго і на твары, і на валасах. Маіх хлопчыкаў тое весяліла, яны смяяліся. «Малы не пераапранаўся пасля садка, — маланкай праносілася думка ў маёй галаве. — Я ж прасіла...» Пальцы на аўтамаце пачалі набіраць заўвагу мужу. Але ў нейкі момант я ў думках паставіла сябе на яго месца і... адаслала вясёлы смайл з подпісам: «Я так рада, што вам весела і што Сымону спадабаўся мой суп». Пасля абмяркоўвалі згаданую сітуацыю з мужам: ён пагадзіўся, што калі б я пачала крытыкаваць, жаданне старацца і ў далейшым заставацца з Сымонам (ну ці як мінімум дзяліцца нейкімі відэапавемленнямі) значна зменшылася б.

Трэба быць вельмі асцярожнымі са словамі, рэзкімі ацэнкамі. Старацца заўважаць больш станоўчага і акцэнтаваць на гэтым увагу — і здарыцца цуд... У чалавека вырастуць крылы, з'явяцца сілы і жаданне радаваць і здзіўляць яшчэ больш. Пастаянная ж крытыка па дробязях ні да чога добрага не прывядзе. Таму, перш чым чарговы раз абурыцца, што паўсюль раскіданы брудныя шкарпэткі ці суп недасолены, лепш моўчкі закінуць тыя ў «пралку» і скарыстацца сальніцай. Дый усміхнуцца і падумаць, якая ж гэта дробязь і ці ж варта з-за яе псаваць чалавеку настрой!

«Маёй свекрыві ўсё не падабаецца, — кажа знаёмая. — Вось нядаўна даслала ёй сямейнае фота. Адмыслова доўга выбірала ідэальнае: здаецца, усе прыгожыя, шчаслівыя, усмешлівыя, няма да чаго прычапіцца. Не! Праз хвіліну прыходзіць паведамленне: «Што за жудасная прычоска ў Сяргея!!!». Гэта прытым, што апошнія пяць гадоў стрыгу Сяргея я, і яму тая прычоска даспадобы». Не падабаецца маці, і як сын адзяваецца, як бавіць час. Лічыць, што толькі яна ведае, як яму лепш. І нават не дапускае думкі, што ў кожнага чалавека можа быць сваё ўяўленне пра тое «лепш». І кожны з нас мае на гэта права, якое, каб захаваць добрыя адносіны, трэба паважаць.

Мой муж, напрыклад, калі яму спадабалася, як яго пракансультавалі ў будаўнічай краме (дзе апошнія чатыры гады бывае вельмі часта), не шкадуе часу і просіць кнігу заўваг і прапаноў. Не, не для таго, каб паскардзіцца, а каб напісаць штосьці добрае ў адрас чалавека. Як правіла, яно выклікае здзіўленне! Бо, сапраўды, заўважце, дрэнныя каментарыі мы пішам тут жа, а добрае кажам рэдка...

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

Тыя, хто побач

ПАЛЁТЫ Ў ВАДЗЕ

і іншыя сакрэты сямейнага тымбілдынгу ад Рыгора і Настассі Зудзілавых

Пакуль міжнародныя чыноўнікі адхіляюць беларускіх спартсменаў ад буйных стартаў, тыя працягваюць упарта трэніравацца і самаўдасканальвацца. У цяжкія часы лепш трымацца разам — так прасцей справіцца з усімі выклікамі. А майстар-клас у гэтым могуць паказаць брат і сястра Настасся і Рыгор Зудзілавы. У абодвух спартсменаў прыроджаная частковая атрафія зрокавага нерва. Абодва — выпускнікі Наваполацкай СДЮШАР «Нафтан». Сёння яны — члены нацыянальнай паралімпійскай каманды па плаванні. Разам трэніруюцца, выступаюць на спаборніцтвах. Праўда, з невялікім адрозненнем. Настасся плавае брасам, а Рыгор — кролем. Таму і ўзнагарод у Рыгора больш: ён старэйшы, і кролем плывуць больш дыстанцый. На міжнародных летніх гульнях паралімпійцаў «Мы разам. Спорт», што прайшлі ў Сочы, Рыгор Зудзілаў заваяваў чатыры залатыя медалі, Настасся — адзін. Але ў гэтай сям'і колькасць узнагарод і іх вартасць — зусім не галоўнае.

ДЗЕ АДЗІН, ТАМ І ДРУГАЯ

Малодшыя заўсёды паўтараюць за старшэйшымі. Выдатна, калі гэта станоўчыя прыклады. У прыватнасці, спорт, як тое атрымалася ў сям'і Настассі і Рыгора Зудзілавых. Старэйшы брат прыйшоў у басейн у восем гадоў, маладзейшая на два гады Насця ад брата не адставала і пачала плаваць у дзевяць гадоў. І вось ужо больш за 10 гадоў брат і сястра з Наваполацка разам праводзяць у басейне амаль увесь час, разам трэніруюцца і выступаюць на спаборніцтвах.

«Мне з дзяцінства падабалася водная стыхія. Аднак з рознастайных відаў спорту больш за ўсё цікавіла барацьба. Але праз праблемы са зрокам дактары забаранілі займацца барацьбой. Нават былі размовы, што і плаваць нельга. Маўляў, празмерныя фізічныя нагрузкі, ціск пры ныранні могуць негатыўна паўплываць на вочы. Прыйшлося дактароў паўгаворваць. З маім дыягназам мне можна плаваць, але медыкі вырашылі перастрахавацца. Таму я з дзяцінства навучыўся сачыць за сваім здароўем. Так не склалася мая барцоўская кар'ера, але пачалася кар'ера плыўца», — успамінае Рыгор.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

Ёсць пытанне

ЧАЛАВЕКУ ПАТРЭБЕН ЧАЛАВЕК

Як справіцца з адзінотай у сталым узросце?

У краінах з традыцыйна высокай працягласцю жыцця створана так званая культура даўгалецця, адзначаюць медыкі. Яна заключаецца ў стварэнні ўмоў для актыўнасці: пажылыя людзі не сядзяць на сваіх паверхах або за платамі дамоў ці лецішчаў. Яны сустракаюцца, маюць пастаянныя зносіны адзін з адным. Для гэтага многае робіцца дзяржавамі, арыентаванымі на доўгае жыццё сваіх грамадзян: напрыклад, ствараюцца спецыяльныя зоны, дзе пенсіянеры могуць сумесна правесці вольны час. Але вялікая і роля сацыякультурных традыцый, успрымання жыцця самімі пажылымі людзьмі. На жаль, канстатуюць геронтолагі, для нашых пажылых жаданне менавіта жыць, а не дажываць, пакуль не асабліва характэрна. І жаданне гэта трэба выхоўваць.

— Адзінота — гэта ў цэлым праблема сучаснага свету, — падкрэслівае **галоўны герыятр Міністэрства аховы здароўя Беларусі Людміла ЖЫЛЕВІЧ.** — І гэтая тэндэнцыя будзе нарастаць. Мы бачым, што практычна паўсюдна ў еўрапейскіх краінах знікаецца нараджальнасць. Праслойка моладзі і людзей сярэдняга ўзросту, якія павінны ўзяць на сябе клопат пра пенсіянераў, становіцца ўсё танчэйшай. Калі пастарэюць тыя, каму цяпер 35—40 гадоў, гэта будзе ў асноўным пакаленне адзінокіх пажылых людзей. І мы павінны гэтыя праблемы прагназаваць, быць да іх гатовыя.

(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)

Вы прасілі расказаць...

ХВАРОБА, АСАБЛІВАСЦІ ХАРАКТАРУ ЦІ НЯВЫХАВАНАСЦЬ?

Як дапамагчы дзіцяці з сіндромам дэфіцыту ўвагі з гіперактыўнасцю

Сіндром дэфіцыту ўвагі з гіперактыўнасцю — пэўныя парушэнні ў псіхаэмацыянальным развіцці дзіцяці. Першыя сімптомы пачынаюць турбаваць з трох гадоў: малы не можа ўседзець на месцы і ўсяляк спрабуе прыцягнуць да сябе ўвагу знарочыстым непаслушэнствам.

Многія бацькі не лічаць неабходнасцю змагацца з сіндромам гіперактыўнасці ў дзяцей, спісваючы дрэнныя паводзіны на ўзрост. Аднак у далейшым хвароба абарочваецца ў школьніка сур'ёзнымі праблемамі: няўменнем канцэнтраваць увагу, непаспяховасцю, частай крытыкай з боку настаўнікаў і сяброў, сацыяльнай ізаляцыяй, нервовымі зрывамі.

Гіперактыўнасць з'яўляецца дысфункцыяй цэнтральнай нервовай сістэмы. Калі яе не лячыць у дзяцінстве, расстройства можа моцна паўплываць на якасць жыцця дарослага чалавека.

Хлопчыкі хварэюць часцей

Хоць неймаверная рухомасць такіх дзяцей адразу кідаецца ў вочы, асноўная прыкмета захворвання ўсё ж не гэта, а кароткі прамежак увагі: дзіця не можа засяродзіцца ні на чым — гульня гэта, вучоба ці прагляд тэлеперадачы.

Пашкоджанне мозга ў такіх дзяцей няма — у іх ёсць невялікія функцыянальныя расстройствы цэнтральнай нервовай сістэмы.

У хлопчыкаў гэта захворванне сустракаецца ў 4—9 разоў часцей, чым у дзяўчынак. Мацней за ўсё яно выяўляецца ў 6—12 гадоў. А далей праблема з медыцынскай і педагагічнай ператвараецца ў сацыяльную: не дасягаючы поспехаў у вучобе, атрымліваючы за дрэнныя паводзіны штурхялі і аплявухі дома, такія дзеці паводзяць сябе ўсё горш і горш. Гэта паказвае і статыстыка: сярод «цяжкіх» дзяцей любога ўзросту шмат маюць сіндром дэфіцыту ўвагі з гіперактыўнасцю.

Своечасовая карэкцыя парушэнняў, у тым ліку праз фарміраванне правільных установак паводзін, стварэнне спрыяльнага побыту і атмасферы, у якіх выхоўваецца і навучаецца дзіця, у многім прадухіляюць развіццё негатыўных праяў і наступстваў гіперкінетычнага расстройства.

Калі такое дзіця паступае ў школу, аказваецца, што яно вельмі адрозніваецца ад іншых. Прадукцыйна працаваць яно можа не больш за 5—15 хвілін, потым 3—7 хвілін яго мозг «адпачывае», назапашваючы энергію і сілы для наступнага працоўнага цыкла. Тым часам дзіця займаецца староннімі справамі і на словы настаўніка не рэагуе. Затым разумовая актыўнасць у яго аднаўляецца, і яно зноў працуе 5—15 хвілін, пасля чаго... мозг зноў «адключаецца».

Такое дзіця можа ўтрымліваць у галаве і аперыраваць невялікім аб'ёмам інфармацыі, большасць новых звестак яно неўзабаве забывае. І доўгачасовая памяць у яго слабая. Яму бывае цяжка засвоіць чытанне, пісьмо і лік, але не таму, што ў яго паніжаны каэфіцыент інтэлекту, а таму, што парушана ўспрыманне. У 7 гадоў такое дзіця, як правіла, яшчэ не гатовае да навучання ў школе, у яго не адбылося поўнага саспявання мазгавых функцый.

Гіперактыўны малы ўвесь час спяшаецца, мітусіцца, бязмэтна хапае прадметы, прыступае да задання, не даслухаўшы настаўніка... Пальцы яго ўвесь час пастукваюць па стале, часам дрыжаць, ногі разгойдваюцца. Яму цяжка самаарганізавацца. У гутарцы ён пераскоквае з тэмы на тэму, можа пакутаваць на цікі, грымаснічаць, здзяйсняць непатрэбныя і дакучлівыя рухі.

У 68 % такіх жыўчыкаў адзначаюцца парушэнні сну, у 40 % — начное нетрыманне мачы. Такія дзеці імпульсіўныя, узбудлівыя і агрэсіўныя. Яны ўвесь час унутрана напружаныя, у іх імгненна мяняецца настрой, яны часта перажываюць пачуццё страху і павышаную трывожнасць.

Малому складана ладзіць і з аднагодкамі. Ён адстае ад іх у псіхічным развіцці, але імкнецца камандаваць і кіраваць. Цяжка складваюцца ў яго адносіны і з дарослымі. Пакаранні на яго не дзейнічаюць, а пахвала не стымулюе добрыя паводзіны. Менавіта «невыхавальнасць» прымушае бацькоў і настаўнікаў задумацца, а ці не трэба паказаць яго ўрачу?

Сёння навукоўцы лічаць, што сіндром дэфіцыту ўвагі з гіперактыўнасцю можа быць выкліканы некалькімі прычынамі. Сярод іх — ускладненні падчас цяжарнасці маці (перанесеныя інфекцыі, прыём некаторых медыкаментаў, несумяшчальнасць крыві маці і дзіцяці); ускладненні падчас родаў (траўмы дзіцяці, нават лёгкая гіпаксія ў неданошаных); хвароба дзіцяці (атручванне ўгарным газам, энцэфаліты, менінгіты, пашкоджанні сэрца); генетычная схільнасць (яна сустракаецца ў 20—30 % выпадкаў, многія бацькі, дзеці якіх гіперактыўныя, былі такімі ж у дзяцінстве); алкагалізм і псіхічныя захворванні ў бацькоў.

Не таблеткі, а работа з псіхолагам і бацькамі

Пры сіндроме дэфіцыту ўвагі з гіперактыўнасцю не існуе ўніверсальнай таблеткі. У тэрапіі лекавыя прэпараты другарадныя, іх прызначэнне апраўдана толькі ў 10 % выпадкаў. Па вялікім рахунку гаворка ідзе нават не пра лячэнне ў шырока вядомым сэнсе, а пра карэкцыю парушэнняў паводзін. Гэта значыць, галоўная роля адведзена зусім не ўрачам, а псіхолагам, педагогам і ў першую чаргу бацькам. На апошніх ускладаецца асаблівая адказнасць.

Як дапамагчы, а не нашкодзіць гіперактыўнаму дзіцяці падчас навукова-практычнага адукацыйнага семінара «Парушэнні паводзін у дзяцей у практыцы ўрача першаснага звяна» расказала **намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай частцы Мінскага гарадскога клінічнага цэнтра дзіцячай псіхіятрыі і псіхатэрапіі, галоўны пазаштатны дзіцячы псіхіятр Міністэрства аховы здароўя Вольга ЛІТВІНАВА.**

Адсутнасць актыўнага медыкаментознага лячэння не павінна ствараць у дарослых, якія выхоўваюць дзіця з гіперактыўнасцю, ілюзію «бяскрыўднасці» расстройстваў увагі і паводзін і лжывых надзей: маўляў, нічога страшнага, з часам перарасце. Сапраўды, многія клінічныя праявы па меры сталення згасаюць, становяцца менш выяўленымі. Многія, але не ўсе.

— Напрыклад, кагнітыўныя асаблівасці, абумоўленыя дэфіцытам увагі, захоўваюцца ў большасці людзей у любым узросце, — тлумачыць Вольга Літвінава. — Па меры сталення дзеці з сіндромам дэфіцыту ўвагі з гіперактыўнасцю схільныя да фарміравання дэвіянтных паводзін, якія характарызуюцца паталагічнай залежнасцю ад алкаголю і іншых псіхаактыўных рэчываў. У будучыні высокая рызыка фарміравання расстройстваў асобы і іншых псіхічных парушэнняў. На жаль, усё гэта стварае неспрыяльны фон для поспехаў у адукацыі і прафесійных дасягненняў.

Своечасовая карэкцыя парушэнняў, у тым ліку праз фарміраванне правільных установак паводзін, стварэнне спрыяльнага побыту і атмасферы, у якіх выхоўваецца і навучаецца дзіця, у многім прадухіляюць развіццё негатыўных праяў і наступстваў гіперкінетычнага расстройства.

Чым могуць дапамагчы бацькі?

Ад дарослых залежыць псіхалагічнае становішча ў сям'і. Яно павінна быць спакойным і камфортным. Не рэдкасць, калі парушэнні паводзін аказваюцца рэакцыяй дзіцяці на траўміруючыя абставіны, напрыклад на крызісную сітуацыю ў сям'і, канфлікты з бацькамі або братамі-сёстрамі, развод бацькоў, адчуванне непатрэбнасці, адзіноты.

Калі такое дзіця паступае ў школу, аказваецца, што яно вельмі адрозніваецца ад іншых. Прадукцыйна працаваць яно можа не больш за 5—15 хвілін, потым 3—7 хвілін яго мозг «адпачывае», назапашваючы энергію і сілы для наступнага працоўнага цыкла.

Дакладны рэжым дня ў сям'і з гіперактыўным дзіцем абавязковы. Ён робіць жыццё ўсёй сям'і больш упарадкаваным.

✓ Навучыце дзіця правільна размяркоўваць сілы, каб захоўваць максімум энергіі на эфектыўную дзейнасць (напрыклад, урокі ў школе або выкананне хатняга задання), а не распыляць яе на другарадныя і непрынцыповыя заданні (напрыклад, зашпільванне гузікаў на кашулі — няхай лепш надзене футболку без зашпілек).

✓ Не прасіце гіперактыўнае дзіця ўзяць сябе ў рукі — лепш навучыце яго кіраваць сабой. Кантраляваць свае эмоцыі і выпусціць пару яму дапамогуць «агрэсіўныя» гульні. Пры гэтым трэба дакладна агаварыць забароненыя, недапушчальныя прыёмы: «Хочаш біць палкай — бі, але не па жывых істотах» (людзях, жывёлах, раслінах). Гіперактыўнаму дзіцяці проста неабходна выплёскваць энергію вонкі — навучыце яго гэта рабіць без шкоды для сябе і навакольных.

✓ Засцерагайце дзяцей ад ператамлення, звязанага з залішняй колькасцю ўражанняў (тэлевізар, камп'ютар), па гэтай жа прычыне пазбягайце месцаў з вялікай колькасцю людзей (крамы, рынкі, масавыя мерапрыемствы).

✓ Недахоп фізічнай актыўнасці можа стаць прычынай павышанай узбуджальнасці. Нельга стрымліваць натуральную патрэбу дзіцяці пагуляць у шумныя гульні, павесяліцца, пабегаць, паскакаць. Таму спартыўныя секцыі і рухомыя гульні павінны быць у раскладзе гіперактыўнага дзіцяці штодзень.

Усе дарослыя члены сям'і павінны прытрымлівацца адзінай лініі паводзін у выхаванні дзіцяці. Падчас выканання хатніх заданняў варта прыбраць усе раздражняльныя фактары. Адна з яркіх клінічных прыкмет расстройства — гэта цяжкасці або няздольнасць дзіцяці ўключыцца ў працу, трымаць увагу падчас працоўнага працэсу і давесці свае дзеянні да канца. Не трэба ўскладняць яму і без таго складаную з-за слабасці функцыянавання нервовай сістэмы задачу. Нішто не павінна адцягваць увагу. Кожныя 15—20 хвілін дазваляйце яму рабіць 5-хвілінны перапынак, каб зняць напружанне і пазбавіцца назапашанай энергіі.

> Стаўце перад дзіцем канкрэтныя задачы, фармулюючы іх сцісла, выразна і ясна. Вялізныя, шматслоўныя заданні гіперактыўнае дзіця папросту не ўспрыме і пакіне без увагі. Не варта даваць некалькі заданняў адразу, напрыклад «ідзі ў свой пакой, пазбірай цацкі, потым памый рукі і сядай абедаць». Паслядоўна прасіце выканаць кожнае ўказанне.

Падмацоўвайце вусныя інструкцыі візуальна. Гэта можа быць маляўнічы штодзённік, куды вы разам з дзіцем будзеце запісваць, напрыклад, час прыёму ежы, выканання хатніх заданняў, прагулак і сну.

— Выкананне любога задання павінна быць абмежавана пэўнымі часовымі рамкамі. Пры сіндроме дэфіцыту ўвагі характэрна скажонае ўспрыманне часу. Такім дзецям цяжка кіраваць часам, правільна яго разлічыць, яны заўсёды схільныя зацягваць працэс, — расказвае Вольга Літвінава.

Абавязкова хваліце дзіця ў кожным выпадку, калі яму ўдалося давесці пачатую справу да канца. У кампетэнцыі бацькоў — вызначыць рамкі і крытэрыі паводзін дзіцяці. Прыдумайце знакавую або бальную сістэму ўзнагароды, напрыклад адзначайце зорачкай кожны добры ўчынак, а за пэўную колькасць зорачак дарыце дзіцяці цацку або ласунак. Можна завесці дзённік самакантролю і адзначаць там разам з дзіцем яго поспехі ў садку, школе ці дома. Узнагароджанне для такога дзіцяці мае вялікае значэнне, прычым яно павінна быць хуткім, а не адтэрмінаваным у часе. У адваротным выпадку дзіця страціць матывацыю.

Перыядычна з боку людзей, асабліва тых, хто не ведае праблематыкі расстройства, паводзіны гіперактыўных дзяцей могуць быць расцэнены як нявыхаванасць, грубасць, неадэкватнасць. Бацькі павінны дакладна растлумачыць дзіцяці правілы паводзін у розных сітуацыях. Але разам з тым колькасць забарон і абмежаванняў трэба звесці да разумнага мінімуму. Татальны кантроль, забароны і абмежаванні не дапамогуць, а, наадварот, пагоршаць праявы паводзінскіх парушэнняў.

Алена КРАВЕЦ.

ПАЛЁТЫ Ў ВАДЗЕ...



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

«Ну, барацьба ў нашым жыцці таксама была. Як і належыць брату і сястры, мы ў дзяцінстве біліся. Прычыны? Ну хіба яны патрэбныя для дзіцячых боек? Грыша, зразумела, быў мацнейшы за мяне, але ж і я не баязліўка. Ужо тады навучылася не здавацца», — смяецца Насця. — «У дзяцінстве мне хацелася не толькі плаваць, але і лятаць. Ды тое аказался не так проста, і Грыша сказаў, што плаваць — гэта амаль як лятаць, толькі ў вадзе. І я вырашыла, што хачу плаваць. Добра памятаю, што было вельмі, ну вельмі ж холадна! А я яшчэ была худой, і ўсе перажывалі, як я буду трымацца на вадзе. Акрамя ўсяго, у вадзе ад холаду я станавілася амаль сіняя — «цудоўнае» відовішча!» — згадвае пачатак сваёй спартыўнай кар'еры Настасся.

Аднак афіцыйны пачатак кар'еры ў брата і сястры здарыўся крыху пазней. Пяты клас стаў для Грышы спартыўным. Тады ўжо і трэніроўкі аказаліся больш сур'ёзнымі, і адказнасць значна выраслa. Неверагодна, але факт: Рыгор Зудзілаў — адзін з тых спартсменаў, хто скончыў школу з залатым медалём. «Не скажу, што я вельмі стараўся вучыцца ў школе, неяк лёгка ўсе давалася і настаўнікі дапамагалі, бо разумелі, што праз плаваць. Гісторыя стала набіраць абароты. Цяпер у Наваполацку прыклад Насці і Грышы збіраецца пераняць іх малодшая сястра. У яе таксама праблемы са зрокам, але ўзор старэйшых мацнейшы за ўсе перашкоды. Праўда, не абыходзіцца без сумненняў. «Ёй прапанавалі перайсці ў спартыўны клас. Але для гэтага трэба мяняць школу. І мы баімся, каб яна не паўтарыла маю памылку. Дзеля спартыўнага класа я памяняла школу, але сяброў там не знайшла. І чатыры гады жыла без сяброў. Не самыя прыемныя ўспаміны, але як ёсць, магчыма, гэта зрабіла мяне мацнейшай. Дарэчы, з таго нашага спартыўнага класа ніхто не займаецца прафесійным плаваннем, акрамя мяне. Ну гэта так, дарэчы», — дзеліцца Настасся.

САМАЕ МОЦНАЕ СЯБРОЎСТВА

У 2015 годзе Настассю і Рыгора Зудзілавых заўважылі як здольных плыўцоў і запрасілі на вучэбна-трэніровачны збор у Мінск. Падзея была вельмі важнай і... цяжкай. Падлеткам прыйшлося самастойна жыць у вялікім незнаёмым горадзе. Але ж удваіх прасцей. І бацькам, вядома, спакайней, што дзеці разам. «Спачатку ў мяне зусім не атрымлівалася жыць самастойна, я вельмі радавалася, што побач старэйшы брат. Адна зусім

Нават траўмы ў іх былі адны на дваіх, абодва перанеслі разрывы сятчаткі вока. Для плыўцоў з парушэннямі зроку гэта не навіна. З-за размерных фізічных нагрузак такое часта здараецца. На жаль, праблемы са здароўем часам перашкаджаюць спартсменам выступаць. На міжнародных спаборніцтвах «Мы разам. Спорт» у Сочы такое здарылася з Настассяй. І зусім не ад дрэннай падрыхтоўкі. «Перад стартамі я ўжо даўно не хвалююся. Нервуюся толькі, калі чагосьці не ведаю. У Сочы некалькі разоў мяняўся расклад. Мяне гэта нервавала. Такое ж здарылася і ў дзень эстафеты. Я прыехала на размінку і даведалася, што старт эстафеты будзе на некалькі гадзін раней. А ў мяне з сабой нічога няма, я не рыхтавалася. Ну што рабіць, паехала па рэчы і ўжо ў нумары зразумела, што выступаць не буду. У мяне часам здараецца мігрэнь, і ў той дзень ад нерваў яна пачалася зноў. Папрасіла сяброў пазваніць трэнеру, таму што сама я ўжо не адрознівала лічбы і літары на экране тэлефона. І калі нашы дзяўчаты плылі эстафету, я тры гадзіны ляжала на падлозе ў ваннай — гэта было адзінае месца, дзе я магла больш-менш нармальна сябе адчуваць», — расказвае Настасся. Рыгор жа ў той час выступаў на дыстанцыі — што рабіць, калі трэба плысці. Дарэчы, пра гэты выпадак брат і сястра расказалі бацькам толькі праз час — не хацелі іх палохаць і турбаваць.

Паралімпійская зборная па плаванні.

трэніроўкі я магу нешта прапусціць, ішлі насустрач. Галоўнае — не ленавацца. Як і ў любой справе», — тлумачыць спарстмен.

«У нас ёсць традыцыйнае свята — дзень, калі мама з татам пазнаёміліся. Мы п'ём таматны сок і ядзім чыпсы».

Шлях у вялікі спорт за братам паўтарыла і Настасся. Але ёй давялося пераадолець некаторыя складанасці. У шостым класе кардыёлаг забараніў дзяўчынцы плаваць — пралапс клапана сэрца. «Шосты і сёмы клас я не трэніравалася. Нават пайшла ў мастацкую школу. На занятках сядзела з біноклем... І аднойчы адчула, што хачу вярнуцца ў басейн», — успамінае Насця. І вярнулася. Праблемы з сэрцам вырашыліся, медыкі зноў дазволілі не справілася б, нават у магазін баялася хадзіць... Не ведала, якія рэчы з сабой браць, везла ўсё, што можна, акрамя патрэбнага. Вельмі пашанцавала, што Грыша быў побач. Мы разам елі салаты з крамы, у якіх адзін маянэз, пілі чай і так спраўляліся», — расказвае Насця. Рыгор прызнецца, што з сястрой яму таксама было камфортней. Яна лепш бачыць і дапамагала брату арыентавацца ў горадзе. Нават ісці па незнаёмых вуліцах пасля трэніроўкі таксама прасцей. Так паступова расквітнела самае моцнае сяброўства — брата і сястры.

Разам яны вучыліся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце фізкультуры па спецыяльнасці «Трэнер-выкладчык». Няхай і з розніцай у некалькі курсаў. Аказваецца, гэта вельмі зручна. У дадзеным выпадку — для Настассі. Заўсёды ёсць каму дапамагчы падчас сесіі, ёсць у каго ўзяць канспекты і падручнікі.

Аснова такога спартыўнага тандэма — падтрымка. Часам Настасся выводзіць Рыгора на старт: «Калі на мяне ўскаладаюць адказнасць, я стараюся на сто працэнтаў. Таму калі я выводжу Грышу на старт, задаю яму тысячу і адно пытанне: ці не пара ісці, ці ўзяў ён акуляры, ці не забыў шапачку... Не думаю, што яму тое вельмі падабаецца, але што ж рабіць?». Саперніцтва паміж імі няма ніякага. Па колькасці медалёў адно аднаго абганяць не імкнуцца, перамогам шчыра радуюцца. Настасся любіць разглядаць медалі брата — для натхнення. Цікава, што Зудзілава — бадай ці не адзіная спартсменка, якой бронзавыя ўзнагароды падабаюцца больш, чым залатыя. Кажа, што выглядаюць яны прыгажэй. Адно слова — дзяўчына...

У Рыгора больш практычны падыход — галоўнае, каб быў медаль. І гэта лёгка растлумачыць. Рыгор Зудзілаў — малады бацька паўтарагадовага сына. «Я стараюся як мага больш увагі ўдзяляць яму, дапамагаць жонцы. Пакарміць, памыць, пакласці спаць — усё гэта магу. Мы пароўну дзелім абавязкі і цудоўна спраўляемся самі. Бываюць, вядома, моманты, калі цяжка. Вось цяпер зубы рэжуцца, спім па дзве гадзіны ў суткі», — расказвае малады бацька. Настасся, якая жыве з сям'ёй брата, — асабісты аніматар маленькага Зудзілава. «Я магу нават пайграць яму на дудцы. Малому падабаецца музыка, але не падабаецца, калі я фальшыўлю. Пачынае гарланіць, калі ў мяне не атрымліваецца. Не цэніць мае старанні. А калі атрымліваецца, то задаволена смяецца», — дзеліцца Настасся.

«Калі нашы дзяўчаты плылі эстафету, я тры гадзіны ляжала на падлозе ў ваннай — гэта было адзінае месца, дзе я магла больш-менш нармальна сябе адчуваць».

«ЛЕДЗЬ НЕ ЗМЫЛА Ў АКІЯН»

Бацькі Настассі і Рыгора жывуць у Навапалоцку. Спартыўны графік не дазваляе брату і сястры часта прыязджаць у бацькоўскі дом. Але калі выпадае такая магчымасць, яны імкнуцца як мага цікавей правесці час разам: «У нас ёсць традыцыйнае свята — дзень, калі мама з татам пазнаёміліся. Мы п'ём таматны сок і ядзім чыпсы. Трэба яшчэ выключыць святло і запаліць свечкі. Бо так было ў дзень іх знаёмства — 18 студзеня. Цяпер не заўсёды атрымліваецца сабрацца поўным саставам. Але мы стараемся тую мілую традыцыю не забываць. Як і многія сем'і, збіраемся на дачы, асабліва на дні нараджэння. Рэжам вядро салаты, гатуем вядро шашлыкоў, прыдумваем конкурсы».

Галоўны трэнер нацыянальнай паралімпійскай каманды па плаванні Генадзь Вішнякоў неаднаразова адзначаў, што ганарыцца сваёй дружнай камандай спартсменаў. Рыгор і Настасся Зудзілавы пацвярджаюць словы свайго трэнера. У іх агульныя сябры па камандзе, і гэта дазваляе камфортней сябе адчуваць на вучэбна-трэніровачных зборах і спаборніцтвах. Хоць часам і дадае турбот. Напрыклад, на Паралімпійскіх гульнях у Токіа ў Рыгора выявілі каранавірусную інфекцыю, спарстмена памясцілі ў ізалятар. А Настасся мала таго, што перажывала за брата, дык яшчэ і хвалявалася за тое, каб яе тэст быў адмоўным. Нават снілася, што яе таксама забіраюць у ізалятар. Затое на Гульнях у Рыа была адваротная сітуацыя — вясёлая: «Увесь час было горача, да 35 градусаў. А ў дзень, калі ў нас быў вольны час, стала 18 градусаў, дождж, вецер. Мы прыехалі на пляж паглядзець на акіян. Па калена зайшлі ў ваду — і нас абдало халоднай хваляй... Уражанні незабыўныя!» — з настальгіяй распавядае Насця. Дарэчы, у планах спартсменкі — выступіць на яшчэ адных Паралімпійскіх гульнях.

Журналісты шмат пісалі пра спартыўную мару Настассі Зудзілавай — пераплыць Ла-Манш. Аднак тое не зусім праўда. «У 2015 годзе ў мяне першы раз бралі інтэрв'ю і спыталі пра маю спартыўную мару. Я вырашыла, што трэба прыдумаць нешта арыгінальнае, і сказала, што хачу пераплыць Ла-Манш. Тады мне было 14 гадоў і я вырашыла, што гэта вельмі арыгінальна. А сёння разумею: праплысці 32 кіламетры ў халоднай вадзе — не самы ўдалы план», — раскрывае карты Настасся. А вось у Рыгора ёсць больш рэальная мэта — прабегчы марафон. Так, 42 кіламетры, каб праверыць свае сілы і здольнасці. Хіба ў спорце гэтага мала?

А што да спорту, то ў брата і сястры мэты супадаюць — забяспечыць сабе фінансавую стабільнасць і паціху заканчваць з плаваннем. Але Рыгор у будучыні ўсё роўна плануе заставацца ў плаванні, толькі ўжо на трэнерскай пасадзе. Тут іх погляды з сястрой разыходзяцца. Настасся хоча развітацца са спортам: стамілася ад яго, ды і ў творчасць цягне. Калі брат і сястра Зудзілавы плануюць скончыць сваю спартыўную кар'еру — не ўдакладняецца. Сёння ў іх віруе работа, рыхтуюцца да чэмпіянату краіны, да наступных стартаў. Зразумела, разам. Свайм прынцыпам яны не здраджваюць: «Мы не стамляемся адно ад аднаго, а падтрымліваем. Родны чалавек — заўсёды самая моцная апора ў жыцці».

Валерыя СЦЯЦКО.

ЧАЛАВЕКУ ПАТРЭБЕН ЧАЛАВЕК

Адзін дома

У сучаснай геранталогіі ёсць паняцце «сацыяльныя герыятрычныя сімптомы», яны характэрныя для многіх краін. Калі з адзінотай сутыкаецца малады чалавек, гэта, безумоўна, дрэнна. Але ён у большай ступені здольны знайсці тое асяроддзе, якое дапаможа яму справіцца з адзінотай. З узростам людзі непазбежна губляюць значную частку сваіх сяброў і звыклае сацыяльнае асяроддзе. І чым даўжэй мы жывём, тым вышэйшая верагоднасць застацца ў адзіноце. Нават нараджэнне дзяцей — не гарантыя, што ў старэчым узросце вы не застаняцеся сам-насам з сабою. Дзеці вырастаюць і нярэдка раз'язджаюцца, сябры паміраюць або таксама становяцца нямоглымі, прафесійныя задачы і зносіны з калегамі застаюцца ў мінулым. І чалавек жыве тымі рэшткамі інфармацыйнага поля, якое было ў яго калісьці. А ў сучаснасці кола зносін часам звужаецца да тэлевізара. Велізарную ролю тут адыгрывае і фізічнае старэнне. Бо з узростам мы становімся заложнікамі свайго цела, яго магчымасцяў, якія скарачаюцца, хранічных хвароб. Пагаршаецца зрок, і чытаць становіцца цяжка. Псуецца слых. Становіцца складана спусціцца без старонняй дапамогі на вуліцу — нават з трэцяга паверха, не кажучы ўжо пра пяты. Між тым вельмі многія старыя жывуць у пяціпавярховуках без ліфта. Медыкі называюць такіх адзінокіх пенсіянераў «вязнямі паверхаў». У зімовае надвор'е, калі становіцца слізка, пажылыя людзі застаюцца «ў зняволенні» ў сваіх кватэрах часам на доўгія тыдні.

Варыянты ёсць

Сёння ў Беларусі створаны і досыць эфектыўна працуюць розныя формы дапамогі адзінокім пажылым людзям, накіраваныя на падтрыманне якасці іх жыцця, распавяла галоўны герантолаг краіны. І калі чалавек па прычыне ўзросту ўжо не можа даглядаць сябе, сітуацыя для яго небезвыходная. Але вельмі важна, каб ён назаўсёды сышлі), ад сваіх блізкіх (яны далёка або занадта занятыя сабой). І пры гэтым ён не заўсёды гатовы атрымаць дапамогу ад дзяржавы.

— Справа ў тым, што часцей за ўсё адзінокія пажылыя людзі хочуць заставацца ў сваім доме. Гэта ўласціва чалавеку — жаданне старэць каля свайго ачага. Гэты тэзіс ментальна прысутнічае ў галаве ў кожнага. І да таго моманту, калі трэба шукаць установу, дзе чалавеку забяспечылі б догляд і ён мог бы мірна дажыць, ён ужо вельмі ўразлівы кагнітыўна, бо ў сталым узросце любыя перамены — глыбокі стрэс, а адаптацыйныя механізмы зніжаныя з прычыны ўзросту...

«Старайцеся бачыць пазітыў, а не негатыў. Таму што ў гэтым выпадку вы будзеце пазітыў таксама і выпраменьваць, а навакольныя будуць гэта адчуваць і цягнуцца да вас. І значыць, адступіць адзінота».

— Менавіта восенню і зімой яны ўсё больш замыкаюцца ў сваіх дамах, замыкаюцца ў сабе. Між тым даказана, што сацыяльная адзінота — адзін з вядучых фактараў развіцця дэменцыі, іншых герыятрычных сіндромаў, — адзначае Людміла Жылевіч. — Дэпрэсія правакуе кагнітыўныя змены. Пачуцці страху і тугі прыводзяць да пагаршэння сну, хвароб кровазвароту, абвастрэнняў хранічных захворванняў.

Адзінокі пажылы чалавек жыве ў пастаянных турботах, таму што не заўсёды можа дапамагчы сабе і баіцца сваёй бездапаможнасці. Ён не бачыць падтрымкі ад сяброў (таму што яны гэткія ж нямоглыя або ўжо пагадзіўся прыняць такі выхад з сітуацыі.

— Гэта можа быць дом сумеснага пражывання — выдатная форма, якая развіваецца ў большай ступені ў сельскай мясцовасці. З вясновымі прамянямі сонца, на агародзе, пенсіянерам весялей, але позняя восень і зіма становяцца для іх часам стрэсу і дэпрэсіі. Таму на зіму пажылыя людзі аб'ядноўваюцца ў такія дамы, разам вядуць гаспадарку, ім дапамагаюць сацыяльныя работнікі. І гэта вельмі спрыяльна адбіваецца на іх здароўі: клопат адзін пра аднаго, камунікатыўнае асяроддзе, агульныя інтарэсы і нават магчымыя канфлікты з суседзямі — усё гэта падтрымлівае ўцягнутасць у жыццё і прыпыняе кагнітыўныя парушэнні. Гэта вельмі добрая форма дапамогі адзінокім пажылым людзям. Як і яшчэ адна новая форма — замяшчальныя сем'і. Асабліва сем'і з дзецьмі. У дарослых не заўсёды ёсць час на зносіны са старымі, а дзеці гатовыя да дыялогу. У вачах пажылога чалавека ўнукі — гэта перспектывы, будучыня. Яны даюць бабулям і дзядулям прагнасць да жыцця і адчуванне запатрабаванасці. Плюс розныя пакаленні ў сям'і забяспечваюць пастаяннае абнаўленне інфармацыі, і пажылы чалавек не адчувае сябе адзінокім.

Вядома, існуюць і такія традыцыйныя формы, як інтэрнаты і дамы састарэлых. Не кожны гатовы да гэтага, але калі адзінокі пажылы чалавек уступае ў фазу залежнасці ад старонняй дапамогі, якую не могуць у поўнай меры забяспечыць сацыяльныя работнікі і найбліжэйшае асяроддзе, дом састарэлых становіцца адзіным правільным рашэннем.

— Інтэрнаты цяпер мяняюцца, там выкарыстоўваюцца сучасныя методыкі, і, галоўнае, там ёсць людзі. Чалавеку патрэбен чалавек, патрэбны зносіны.

Што рабіць з адзінотай?

Такім чынам, што рабіць пажылому чалавеку з адзінотай?

• Падтрымліваць разумовае і фізічнае здароўе

— Спачатку трэба вырашыць, ці гатовыя вы пайсці на вышэйпералічаныя меры. Калі не гатовыя, катэгарычна адмаўляйце (і такіх людзей нямала), у гэтым выпадку кожны адзінокі пажылы чалавек павінен разумець: ён сам клапоціцца пра сябе, а для гэтага павінен падтрымліваць сваё здароўе, як фізічнае, так і разумовае, каб даўжэй заставацца незалежным. І адзін з аспектаў падтрымання ментальнага (ды і фізічнага) здароўя — імкненне ствараць сацыяльныя сувязі.

У гэтым могуць дапамагчы сучасныя тэхналогіі, кажа галоўны герантолаг.

— Мы заўсёды стараемся матываваць пажылых людзей на навучанне кантактаванню ў сацыяльных сетках. У інтэрнэце ім будзе нескладана знайсці блізкіх па ўзросце людзей, носьбітаў іх агульнага гістарычнага мінулага, з якімі пажылы чалавек лёгка знойдзе паразуменне. І гэта пастаяннае абнаўленне інфармацыі, разнастайнасць, зносіны.

Гаджэты могуць стаць «палачкай-ратавалачкай» для людзей, якія абмежаваны фізічна.

— Часам даводзіцца чуць ад пенсіянераў: не магу асвоіць мабільны тэлефон, камп'ютар або планшэт. Але гэта не так. Як правіла, усё атрымліваецца, калі маладыя людзі з акружэння такога чалавека — сваякі, суседзі, знаёмыя, сацыяльныя работнікі — праявяць настойлівасць і цярпенне.

• «Ісці ў людзі»

Але толькі сацсетак недастаткова, адзначае спецыяліст. Адзінокі пажылы чалавек не павінен ленавацца: яму неабходна «выходзіць у свет», «ісці ў людзі».

— Вядома, прадукты, калі пажылы чалавек гэта ўмее, зручна заказваць анлайн з дастаўкай дадому. Але па бохан хлеба лепш схадзіць самімі нагамі. Атрымаць фізічную нагрузку, а таксама прапрацаваць маўленчую функцыю — пагутарыць з прадаўцамі або навакольнымі. Нават паход у найбліжэйшы прадуктовы магазін дасць зусім іншы дыяпазон уражанняў. А калі не заседжвацца дома, хадзіць у музеі, тэатры, на выставы — гэта дапаможа адчуць сябе больш шчаслівым і стаць здаравейшым.

• Заўважаць пазітыў

— Пажылому чалавеку вельмі важна атрымліваць пазітыўную інфармацыю, — падкрэслівае Людміла Аверкіеўна. — Падчас сімпозіума геранталагаў, што праходзіў у Паўднёвай Карэі, якая лідзіруе па колькасці доўгажыхароў, мне давялося назіраць такую з'яву: людзі, пераважна пажылыя, у шэсць раніцы адпраўляюцца ў горы, каб паглядзець на ўзыход сонца. Яны распавялі, што хочуць атрымаць дозу прыгажосці, каб пражыць свой дзень. Для таго каб пачаць дзень з прыгажосці, нашаму пажылому чалавеку не трэба ехаць у горы на край свету — парадуйцеся, што ў вас каля дома заквітнела вішанька. Або заўважце, як прыгожа клён скідае лісточкі. Старайцеся бачыць пазітыў, а не негатыў. Таму што ў гэтым выпадку вы будзеце пазітыў таксама і выпраменьваць, а навакольныя будуць гэта адчуваць і цягнуцца да вас. І значыць, адступіць адзінота.

• Наладжваць кантакты

— Не чакайце, калі ў вас хтосьці нешта папросіць, — раіць галоўны герыятр. — Прыведу прыклад. У мяне ёсць пажылая суседка, якая даглядае кветнік каля нашага шматпавярховага дома. І ўсе ёй дзякуюць, усе радуюцца прыгажосці. Суседзі кажуць пра яе: «Наша фея». І яна горда ходзіць па двары з гэтым «тытулам». Вельмі важна знайсці асабістую запатрабаванасць. Гэта можа быць клумба. А магчыма, у суседкі першакласнік не можа справіцца з урокамі, а бацькам няма калі займацца з ім — прапануйце сваю дапамогу. На самай справе варыянтаў мноства, калі не будаваць вакол сябе «ахоўную сцяну адзіноты».

Найлепшы спосаб не быць адзінокім — не замыкацца ў сабе, ісці на камунікацыю, падкрэслівае спецыяліст. Дзе пазнаёміцца пажылому чалавеку? Не толькі на лавачцы ў парку.

— Сёння практыкуюцца такія формы, як універсітэты трэцяга ўзросту, курсы для прадстаўнікоў «залатога веку», пры паліклініках ствараюцца Школы актыўнага даўгалецця. Прыходзьце — вы знойдзеце, з кім камунікаваць. У Рэспубліканскім геранталагічным цэнтры таксама створаны зоны, дзе людзі могуць кантактаваць, знаёміцца, мець зносіны.

• Перастаць бурчэць

І, вядома, вельмі важная добразычлівасць. Калі вы добразычлівыя, ведаеце сваіх суседзяў, яны звяртаюцца да вас па бытавых пытаннях і, у сваю чаргу, заўсёды гатовыя дапамагчы. Не трэба злавацца, быць буркліваым і, галоўнае, не трэба павучаць. Фразу «Вось у наш час...» варта наогул выключыць з абароту. Лепш падтрымаць маладых, падказаць, калі вы кампетэнтныя, і не навязвацца.

• Шукаць захапленні

Менавіта хобі могуць стаць асновай зносін і пошуку блізкіх па духу. Не факт, што той ці іншы занятак спадабаецца адразу. Калі вы зазірняце ў сваё мінулае, то ўспомніце, што ў дзяцінстве і юнацтве спрабавалі многае, перш чым знайсці справу па душы. Даведвайцеся, хто з вашых аднагодкаў чым займаецца. Спрабуйце валіць воўну, маляваць, вывучаць мовы, асвойваць камп'ютар. Добра падтрымліваюць здароўе пажылых людзей танцы, асабліва парныя, — яны, акрамя фізічнай нагрузкі, даюць яшчэ і тактыльныя адчуванні.

— Многія пажылыя людзі знаходзяць сябе на ніве літаратуры: пішуць вершы, ствараюць мемуары. Літаратура падштурхоўвае чалавека абмяркоўваць сваю творчасць — і гэта павялічвае кола зносін.

• Стварыць пару

Сучасныя пажылыя людзі нярэдка шукаюць магчымасць пазнаёміцца і сфарміраваць пару. Сёння гэта нармальная з'ява, і геранталагі ўхваляюць такую тэндэнцыю. Сумеснае пражыванне — выратаванне ад адзіноты і падтрымка адно аднаго. Ствараючы пары, пажылыя становяцца адно для аднаго матываторамі актыўнага жыцця і даўгалецця. І тут ніякіх абмежаванняў па ўзросце быць не можа.

• Завесці гадаванца

Ад адзіноты ратуюць і жывёлы.

— Нашы пажылыя людзі прывыклі ўсё аддаваць — дзецям, унукам, праўнукам, а да іх саміх душэўная аддача прыходзіць не заўсёды. Застаўшыся ў адзіноце, старыя па-ранейшаму адчуваюць патрэбу аддаваць камусьці сваё цяпло і любоў. У гэтым дачыненні хатнія жывёлы — вельмі ўдзячныя партнёры. Старыя прывязваюцца да іх, іх жыццё напаўняецца сэнсам.

• Цвяроза ацэньваць свае сілы

— Змагацца з адзінотай можна і трэба, але калі ў пажылога чалавека ўзнікае фізічная залежнасць ад старонняй дапамогі. Важна зразумець, што пройдзена мяжа, калі чалавек ужо не можа знаходзіцца адзін дома — гэта папросту небяспечна. І прыняць адзінае правільнае рашэнне: дазволіць спецыялістам забяспечыць якасць вашага жыцця, — падкрэслівае галоўны герыятр Беларусі.

І яшчэ адзін нюанс — юрыдычны аспект адзіноты, які таксама важна ўлічыць.

— Неабходна не ўпусціць момант, калі вы павінны прыняць пэўныя маёмасныя рашэнні. Важна, каб вашы рашэнні былі зафіксаваны натарыяльна і даверaны надзейным людзям, у якіх вы ўпэўненыя.

— Адзінота — велізарная ўразлівасць, — кажа Людміла Аверкіеўна. — На шчасце, ёсць пажылыя, якія ўмеюць правільна ставіцца да свайго ўзросту і выбудоўваць адносіны з навакольнымі: яны не адчуваюць сябе адзінокімі, хоць сваякоў у іх няма. Але часцей чалавека зацягвае гэта праблема, і ён пачынае як фізічна, так і псіхалагічна адгароджвацца ад свету. І гэта адгароджванне — сігнал рашыцца і разбурыць «сцяну». Бо пачуццё ўцягнутасці ў жыццё не дае дзменцыі ніводнага шанцу.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Дробязі (асабістага) жыцця

ПРА МУЖЧЫН, ЖАНЧЫН І ІНШЫЯ АКАЛІЧНАСЦІ

Вяртанне блуднага мужа

Крыўдна, балюча і непрыемна, калі цябе пакідаюць, пражыўшы з табою не год і не два.

— Дрэнь!.. Нягоднік!.. Пачвара! — сяброўка спыняецца ўсяго на некалькі секунд, каб перавесці дух і набраць у лёгкія чарговую порцыю паветра. Мабільны тэлефон распаляецца не на жарт, ад яго ва ўсе бакі разлятаюцца нябачныя іскры.

Аказваецца, нягоднік усё жыццё хадзіў налева. І пастаянна заглядаўся на чужых жанчын. І выпіць быў мастак. І скнара аказаўся яшчэ той — адчытвайся яму за кожны патрачаны рубель. І зануда. І лайдак. Ды і ў ложку, мякка кажучы, асаблівага геройства не праяўляў... І вось, ведаючы пра ўсе свае заганы, ён набраўся яшчэ большага нахабства і кінуў яе, бедную, дажываць жыццё ў адзіноце (дарослыя дзеці не лічацца).

